

# РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА

2

ЛЮТЫ 1961

+ прил.

## На Рэспубліканскай мастацкай выстаўцы
















Вы бачыце тут толькі вельмі нямногае з таго, што паказалі беларускія мастакі на Рэспубліканскай выстаўцы 1960 года, чым жыве наша Беларусь сёння: герояў Салігорска і перадсвяточныя клопаты жыхароў сталіцы, першыя крокі сельскай настаўніцы і ажыццёўленыя мары пастушкі.

На здымках (злева ўніз): Манасзон М. І. «Мінск перадсвяточны»; Кудрэвіч Р. В. «Першае знаёмства»; Данцыг М. В. «Я знаю, горад будзе Салігорск». (Справа ўніз): Жолтак В. К. «Восень»; Давідовіч І. А. «Гідраэлектрастанцыя «Дружба народаў»; Лагун У. А. «Завочніца».



Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

**РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА**

ВЫДАННЕ ЦК КП БЕЛАРУСІ

ГОД ВЫДАННЯ ТРЫЦЦАЦЬ СЁМЫ

№ 2

ЛЮТЫ 1961

Государственная БИБЛИОТЕКА СССР имени В. И. ЛЕНИНА 1961 г.

18567

# XXII з'езду КПСС — мільёны працоўных падарункаў

ПАЧАТАК гэтага года азнаменаваўся вялікімі падзеямі ў жыцці краіны. Важнейшая з іх — студзеньскі Пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Да работы Пленума была прыкавана ўвага ўсяго савецкага народа, усіх нашых сяброў за рубяжом. Ён зойме важнае месца ў жыцці партыі і ўсёй краіны.

На Пленуме адбылася вялікая і гарачая размова аб стане нашай сацыялістычнай сельскай гаспадаркі і аб шляхах яе далейшага магутнага ўздыму. У пастанове Пленума, у гістарычнай прамове на ім таварыша М. С. Хрушчова ясна ўказаны гэтыя шляхі.

Нябачана высокімі тэмпамі развіваецца наша сацыялістычная прамысловасць. За першыя два гады сямігодкі аб'ём прамысловай прадукцыі ўзрос на 22,1 працэнта. Гэта намнога больш, чым намячалася на гэтыя гады сямігадовым планам. Значныя нашы поспехі і ў сельскай гаспадарцы.

Дзякуючы нястомным клопатам партыі і ўрада з кожным днём усё прыгажэйшым і лепшым становіцца жыццё савецкага чалавека. Кожны з нас адчувае гэта на сабе, на прыкладзе сваёй сям'і. У кожнай сям'і ў апошнія гады значна больш, чым раней, спажываецца мяса, малака, масла. У мільёнаў і мільёнаў савецкіх людзей палепшыліся жыллёвыя ўмовы, усе мы лепш пачалі апранацца.

Больш чым на 3 мільярды пудоў узрасла вытворчасць збожжа ў краіне за сем апошніх год. Вытворчасць мяса ўзрасла ў паўтара раза, а закупкі — у два з лішнім раза. Вытворчасць малака павялічылася ў 1,7 раза, а закупкі — амаль у два з палавінай раза. Гэта вялікія поспехі. Аднак Пленум ЦК КПСС лічыць, што дасягнуты ўзровень і тэмпы росту вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў, асабліва прадуктаў жывёлагадоўлі, з'яўляюцца недастатковымі. Пленум адзначыў, што пры разглядзе пытання аб задавальненні патрэбнасцей краіны ў прадуктах жывёлагадоўлі нельга не ўлічваць важныя змены, якія адбыліся за апошнія гады. У нашай краіне хутка павялічваецца насельніцтва, растуць прыбыткі працоўных. У сувязі з гэтым павышаецца і попыт на прадукты харчавання.

Партыя робіць усё для таго, каб савецкія людзі жылі яшчэ лепш, каб растучы попыт насельніцтва на прадукты харчавання і тавары народнага ўжытку задавальняўся цалкам, каб вытворчасць заўсёды апярэджвала попыт. Партыя вучыць, што барацьба за няўхільны ўздым сельскай гаспадаркі з'яўляецца важнейшай умовай пабудовы камуністычнага грамадства. Магутнасць нашай Радзімы, рост яе прамысловасці і абароназдольнасці дазваляюць цяпер выдзеліць дадатковыя сродкі на развіццё сельскай гаспадаркі. Гэтыя дадатковыя сродкі пойдуць на павелічэнне выпуску трактараў і іншых сельскагаспадарчых машын, на лепшае забеспячэнне калгасаў і саўгасаў мінеральнымі ўгнаеннямі, будаўнічымі матэрыяламі.

Партыя ставіць задачу — у бліжэйшы час стварыць такія ўмовы, каб сельская гаспадарка не залежала ад капрызаў прыроды, каб кожны год, пры любых кліматычных умовах, краіна атрымлівала высокія ўраджаі, неабходную колькасць прадуктаў для задавальнення ўсіх патрэбнасцей народа. Хутка надыдзе такі час, калі засуха не будзе нам страшнай. Яна адступіць перад савецкім чалавекам. Яго намаганнямі, яго воляй мільёны гектараў зямлі атрымаюць неабходную вільгаць. Надзейным сродкам атрымання гарантаваных ураджаяў з'явіцца ірыгацыя — арашэнне і абвадненне зямлі.

Партыя лічыць, што галоўнае зараз заключаецца ў тым, каб найбольш поўна выкарыстаць наяўныя магчымасці для рэзкага павелічэння вытворчасці збожжа, тэхнічных культур, бульбы і гародніны, мяса, малака і іншых прадуктаў ужо ў гэтым годзе і ў бліжэйшыя гады.

На Пленуме вырашана, што для поўнага задавальнення патрэбнасцей дзяржавы трэба давесці ў бліжэйшыя гады дзяржаўныя закупкі збожжа штогод да 4 мільярдаў 200 мільёнаў пудоў, мяса — да 13 мільёнаў тон, малака — да 50 мільёнаў тон. Вызначан канкрэтны ўклад кожнай рэспублікі ў вырашэнне гэтай задачы. Наша рэспубліка павінна забяспечыць закупку 23 мільёнаў пудоў збожжа ў год, мяса — 510 тысяч тон, малака — 2.200 тысяч тон. Усе намаганні беларускага народа, уся наша воля павінны быць накіраваны на тое, каб выканаць гэтае баявое заданне партыі.

З велізарным натхненнем сустрэў увесь савецкі народ пастанову Пленума аб скліканні 17 кастрычніка гэтага года чарговага XXII з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Кожны з'езд партыі — велізарная падзея ў жыцці нашай краіны. XXII з'езд падвядзе вынікі камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне, разгледзіць і наметыць план нашага пераможнага шэсця. З'езд прыме новую праграму партыі, якая з'явіцца светачам далейшага руху наперад, да ззяючых вяршынь камунізма.

Увесь савецкі народ жыве зараз адным імкненнем, адным жаданнем — азнаменаваць чарговы XXII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза новымі поспехамі ў працы. У нашай рэспубліцы горача падхоплен заклік ленінградцаў — падрыхтаваць да XXII з'езду партыі мільёны працоўных падарункаў.

«Будзем змагацца за высокае званне прадпрыемства камуністычнай працы, да канца года дадзім на мільёны рублёў звышпланавай прадукцыі»,— заявіў калектыў Мінскага трактарнага завода, рыхтуючыся да дастойнай сустрэчы з'езду. На працоўную вахту ў гонар з'езду сталі работніцы віцебскай фабрыкі «КІМ», будаўнікі Салігорскага камбіната, гомсельмашаўцы. Магутная хваля сацыялістычнага спаборніцтва ахапіла ўсе нашы прадпрыемствы. Заклік ленінградцаў знайшоў жывы водгук і ў сэрцах сельскіх працаўнікоў.

Свінарка-тысячніца саўгаса «Чавускі» Чавускага раёна Елізавета Крывазубава піша: «Калі я пачула па радыё, што 17 кастрычніка пачне работу чарговы XXII з'езд партыі, то вырашыла да яго адкрыцця адкарміць не менш 1.500 свіней». Няма сумнення, што ў перыяд падрыхтоўкі да з'езду ў нас у рэспубліцы значна павялічыцца колькасць удзельнікаў выдатнага руху за камуністычную працу.

Нашымі маякамі назваў у прамове на Пленуме ЦК КПСС Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў перадавікоў вытворчасці. «Давайце,— сказаў ён,— возьмем арыентацыю на гэтыя маякі». Сярод работніц і калгасніц нашай рэспублікі шмат такіх перадавікоў, да якіх непасрэдна адносяцца гэтыя словы таварыша Хрушчова. Лепшай, першай даяркай рэспублікі называем мы Героя Сацыялістычнай Працы Лідзію Іванаўну Асіюк з калгаса імя Жданава Брэсцкага раёна. Яна па праву заваявала гэтае ганаровае месца. З году ў год Лідзія Іванаўна дабіваецца ўсё больш высокіх удояў малака. У 1960 годзе яна надаіла ад кожнай каровы па 6.130 кілаграмаў малака.

Яшчэ зусім нядаўна Герой Сацыялістычнай Працы з саўгаса імя Дзяржынскага Капыльскага раёна Ганна Гаўрылаўна Нікульская лічылася самай лепшай свінаркай у рэспубліцы. А цяпер у яе ўжо многа «саперніц». Ганна Гаўрылаўна радуецца іх поспехам гэтак жа, як і сваім.

XXII з'езд КПСС савецкі народ назваў з'ездам будаўнікоў камунізма. Няхай жа дні падрыхтоўкі да гэтай важнейшай гістарычнай падзеі стануць днямі геройчнай працы па датэрміноваму выкананню трэцяга года сямігодкі. Няхай кожная жанчына нашай рэспублікі прыме гарачы ўдзел у падрыхтоўцы мільёнаў працоўных падарункаў у гонар з'езду!

# ШЧЫРАСЦЬ — ЯЕ ХАРАСТВО

ЖАНЧЫНА не паспела зачыніць дзверы, як зазваніў тэлефон. Яна пачала штосьці растлумачваць, і яе мяккі прыемны голас роўна струменіць у трубку. Жанчына вельмі спакойная. Ці гэта толькі здаецца? Бо той, з кім яна гаворыць, відаць, апраўдваецца і аб нечым просіць.

— Не-не. Райком нікому не даваў такіх паўнамоцтваў, каб устанаўліваць свае тэрміны, — па-ранейшаму спакойна і ўпэўнена гучыць яе голас.

Нават не прыкмеціш, што ў ім прамільгнула нотка настойлівасці. Твар усё такі ж прыветлівы і адкрыты, калі яна пачала штосьці тлумачыць, даказваць, абгрунтоўваць свой, а, значыць, і райкомаўскі пункт гледжання.

Няма куды ўжо адступаць перад яго пераканаўчасцю. І ўжо зразумеў чалавек на другім канцы провада, што інакш нельга, што даручэнне трэба выканаць у тэрмін. Зразумеў ён, хоць жанчына і не напамінала пра абавязак, дысцыпліну, а толькі шчыра пажадала добрага здароўя і развіталася.

А дзень пачынаўся зусім звычайна, асабліва гэты — прыёмны. Адзін за адным адчыняюць наведвальнікі дзверы з шыльдачкай «Г. І. Ігнацьева» і, калі можна так сказаць, «блакіруюць» жанчыну сваімі пытаннямі. Іх шмат у людзей, і часам самых нечаканых. У такі ж дзень прыйшла да яе выпускніца сярэдняй школы Людміла Доннікава і з усёй сваёй шчырасцю запытала:

— Па якой дарозе лепш пайсці ў жыццё? — і тут жа дадала: — Дапамажыце мне, Галіна Іосіфаўна, выбраць правільную.

Што адказаць, што параіць гэтаму шчыраму сэрцу, якое насцярожылася і чакае, чакае і верыць у цябе? Ледзь прыкметная задуменнасць на хвіліну затрымалася ў жаночых вачах. Хто ведае, мабыць, гэта ўспамін аб тым, як сама шукала свой шлях, як вось у такіх жа семнаццаць год скончыла індустрыяльна-педагагічны тэхнікум і вельмі бянтэжылася перад сваімі равеснікамі, вучнямі 11-й сярэдняй школы, — іх трэба было вучыць. Тады яна і вырашыла перайсці лепш да малодшых, у пачатковую школу. Праз якіх чатыры гады ўжо скончыла вячэрні настаўніцкі інстытут і стала працаваць у трэцяй сярэдняй школе горада.

Ну, а што адкажаш той, што застыла перад табой у чаканні? Якія ў яе схільнасці, здольнасці? Вочы жанчыны з мацярынскай цеплынёй глядзелі на дзяўчынку.

— Дарог, як ты кажаш, сапраўды шмат і для кожнага свая, — згадзілася Галіна Іосіфаўна. — Яе толькі трэба знайсці, адрозніць сваю ад іншых. Што ж, я гатова табе дапамагчы, толькі нам патрэбна яшчэ раз сустрэцца.

Галіна Іосіфаўна звязалася са школай, з выкладчыкамі, класным кіраўніком і высветліла, чым больш за ўсё захаплялася былая вучаніца, якія ў яе здольнасці, да чаго яна больш схільная. Таму пры наступнай сустрэчы яна ўжо магла сказаць:

— Раю табе пайсці на завод электраапаратуры. Спадзяюся, што спадабаецца, ды і абмотчыцы там патрэбны.

А чым жа дапамагчы вось гэтай жанчыне, якая сядзіць насупраць Галіны



Галіна Іосіфаўна Ігнацьева.
Фота Ф. Раманава.

Іосіфаўны? Гэта Кабанчук, работніца завода трактарных пускавых рухавікоў. Крыўду і гора яе зразумець няцяжка. Муж пайшоў да іншай жанчыны і «ўкраў», як яна сказала, дачку. Проста забраў дзяўчынку са школы і не аддае маці.

— Толькі вас, Галіна Іосіфаўна, ён паслухае, — гаворыць яна. — Напішыце запіску, каб аддаў дзіця. Ён жа камуніст...

Не, запіска тут наўрад ці дапаможа. Трэба інакш разбіраць справу. У практыцы Галіны Іосіфаўны гэта другі такі выпадак, калі бацька «адбірае» ў маці дзіця. Тады таксама «ўкраў» і спачатку ніяк не маглі яго прымусіць вярнуць. А потым разам з дзіцем сам вярнуўся да жонкі, і сям'я захавалася. А можа і зараз як-небудзь удасца пераканаць?

«І адкуль у яе столькі шчырасці, чуласці да людзей, павагі, — думае пра сябе Людміла Васільеўна Шапарава, чакаючы, пакуль Галіна Іосіфаўна закончыць размову. — Калі ні прыйдзеш, у яе хто-небудзь ды ёсць. І заўсёды яна то ўважліва выслухоўвае чалавека, то далікатна раіць яму штосьці, то тактычна папраўляе яго. Такой вось і ў школе яе памятаюць. Ды хіба толькі ў школе?»

* * *

...У горадзе больш немагчыма было заставацца. Пачаліся бамбёжкі. Муж Сямён Пінчук, апалчэнец, ужо каторы раз прасіў у пісьме, каб Галіна эвакуіравалася, каб зберагла Лёніка, іх першынца. А тут маці Алена Іванаўна Ігнацьева не можа вырвацца. Яе і яе сяброўку Паліну Нікандраўну Кавалёву затрымаў райком. Вядома, шмат спраў у камуністак перад эвакуацыяй устаноў. Прыйшлося Галіне адной з дзіцем на руках пакідаць родны горад. А маці толькі прыбегла на вакзал перад адыходам поезда. З ёю была і Паліна Нікандраўна.

— Гэта яе дзеткі, — паказала маці на хлопчыка і дзяўчынку. — Вазьмі і іх, дачушка.

У Старабельск прыехала жанчына з двума Лёнікамі і Тасяй. Што рабіць? Працаваць няма дзе. Дамовілася была з дырэктарам дзіцячага дома, каб узяў на работу. А ён, як даведаўся, што на жаночых руках не адно, а аж трое дзяцей, тут жа адмовіў:

— Не магу столькі ўтрыманцаў карміць.

Зноў пацягнуліся цяжкія дні. Пазней дырэктар параіў уладкаваць у дзіцячы дом старэйшага Лёню і згадзіўся, нарэшце, узяць завучам Галіну Іосіфаўну. Пайшла яна ў райком партыі за накіраваннем. Вельмі ўважліва выслухаў яе сівагаловы сакратар і раптам як адрэзаў:

— Даволі, наслухаўся я розных легенд аб чужых дзецях, а цяпер лепш скажыце, кім усё ж яны вам даводзяцца?

Што гэта? Не паверыў, усумніўся ў яе шчырасці? Дарэмна старалася яна заставацца спакойнай. Крыўда сціснула сэрца, і слёзы самі паліліся з вачэй. І хто ведае, можа яны і былі лепшым доказам праўдзівасці яе слоў. Так стала Галіна Іосіфаўна завучам і працавала ім усю вайну.

Хутка ў Старабельск да яе прыехала маці — Алена Іванаўна з Палінай Нікандраўнай. І ўжо разам, «сям'ёй» падаліся на Усход гэтыя жанчыны. Гнаныя ворагам, ратавалі яны тры сотні савецкіх рабят з дзіцячага дома. Пяцьдзесят дзевяць дзён дабіраліся да Новасібірска. Сілы, здавалася, пакідалі іх. Пакуль была мука, праснакі выручалі. Галіне Іосіфаўне і Паліне Нікандраўне нормай было выпекчы іх трыста штук на бляшанай печы, каб хапіла кожнаму. А дзіцячыя хваробы? Ні ўрача, ні медсястры. Самі лячылі. Феліксу не маглі дапамагчы ні Галіна Іосіфаўна, ні Паліна Нікандраўна. У Барабінску рашылі доктару яго паказаць. Тут і адсталі ад поезда. Тры дні галодныя «зайцамі» дабіраліся яны да Новасібірска.

Аж да сорак пятага там і жылі. Галіна Іосіфаўна была завучам у адным дзіцячым доме, Алена Іванаўна загадвала другім. Там і адшукалі жонку і сына партызанскія пісьмы Сямёна Пінчука ў сорак трэцім, зімой. Толькі аўтара іх не было ўжо ў жывых. Немцы забілі мужа і бацьку пад Асіповічамі. Здавалася, назаўсёды апусцела сэрца Галіны Іосіфаўны.

Але трэба было жыць. І хутка людскія нягоды, клопаты сталі паступова запаўняць гэтую пустэчу. Галіна Іосіфаўна выкладае матэматыку ў 27-й школе. І яе Лёнік там вучыцца. Разам яны па-

бывалі ў ваенкамаце і атрымалі бацькаў ордэн. Заўсёды ўдваіх і ў школу хадзілі. А ў выхадныя і святочныя дні станавіліся на лыжы і разам з матчыным класам ішлі ў лес. А вечарамі і сын і маці садзіліся за падручнікі.

Пасля вайны Галіна Іосіфаўна закончыла педагагічны інстытут. Яшчэ раней яна стала камуністам. Тры гады была сакратаром школьнай партыйнай арганізацыі. А потым чацвёртая партыйная канферэнцыя Чыгуначнага раёна. З таго часу прайшло ўжо восем год. І ўсе гэтыя гады Галіна Іосіфаўна Ігнацьева нязменны сакратар райкома партыі па прапагандзе.

Звычайны для савецкай жанчыны жыццёвы шлях. Гора не абыходзіла яе лёс. Мабыць, яно і выхавала ў ёй такую шчырасць і чуласць да людзей. «Так яно, пэўна, і ёсць», — сама адказвае на свае думкі Людміла Васільеўна, падсаджваючыся бліжэй да стала сакратара.

— Што ў нас новага, Людміла Васільеўна? — твар Галіны Іосіфаўны яшчэ больш ажывіўся. Пад словам «у нас» абедзве разумеюць сваю 27-ю школу. Людміла Васільеўна Шапарава там зараз сакратар партыйнай арганізацыі.

— Хочам выступіць з адной ініцыятывай. Вось і прыйшла параіцца.

Людміла Васільеўна расказвае, што, выконваючы рашэнні Пленума ЦК КПБ аб выхаванні дзяцей, камуністы іх школы прапануюць правесці адкрытыя партыйныя сходы на «Гомсельмашы» і ва УНР-43.

— Але мы яшчэ не ведаем, як лепш гэта зрабіць, — прызнаецца яна. — Трэба, відаць, падрыхтаваць даклад аб выхаванні дзяцей у школе і дома. На «Гомсельмашы» працуе якраз большасць бацькоў нашых вучняў.

— А на маю думку, Людміла Васільеўна, лепш будзе, калі гэты ж даклад зробяць сакратары цэхавых партарганізацый завода, — заўважае Галіна Іосіфаўна. — Настаўнікі ж хай прысутнічаюць на гэтых сходах і, калі патрэбна, выступяць у спрэчках. Так зрабілі, напрыклад, на металазаводзе.

Праўда, там не настаўнікі, а жаночы савет узяў ініцыятыву ў свае рукі. Члены яго пабывалі ва ўсіх школах, дзе займаюцца дзеці іх рабочых. Пабывалі яны і ў школьнікаў дома. Багаты матэрыял сабралі для даклада, з якім выступіў сакратар партарганізацыі. Многім перапала перцу і ў выступленнях членаў жонсавета.

А Галіна Іосіфаўна, трэба сказаць, школу трымае пад асобым кантролем. Яна сама кіруе семінарам сакратароў партарганізацый. Раз у два месяцы яны, як правіла, збіраюцца ў яе кабінеце і абмяркоўваюць шматлікія пытанні. На адным з іх, напрыклад, гаворка ішла аб узроўні выкладання гісторыі. І не проста гаворка. Спачатку Людміла Васільеўна Шапарава правяла ў сваёй школе адкрыты партыйны сход па гэтаму пытанню. Перад гэтым праведзена шмат адкрытых урокаў гісторыі ў 27-й школе.

Сакратары многіх партыйных арганізацый пабывалі на іх і на адкрыты партыйны сход прыйшлі. А назаўтра сабраліся ў Галіны Іосіфаўны і абмяняліся думкамі-заўвагамі. Сёння ж за парадай да яе звярнуліся Максім Куліч Казялец і Тамара Васільеўна Сафронава з 4-й школы. У іх будзе праходзіць такі ж семінар аб ідэйнасці выкладання мовы і літаратуры.

...Галіна Іосіфаўна раз-пораз пазірае на гадзіннік. Сёння заняткі ў сетцы партыйнай і камсамольскай асветы. У шматлікіх гуртках сёлета займаецца каля 22 тысяч чалавек. Адных эканамічных гурткоў 353. І яна, сакратар райкома, кожны панядзелак звычайна ідзе на заняткі ў які-небудзь з іх. Вось і сёння трэба ўжо ісці, а тут людзі на прыём прыходзяць і прыходзяць. Віктар Мікалаевіч Якаўлеў, першы сакратар, без слоў разумее Галіну Іосіфаўну, моўчкі бярэ з яе стала некалькі спраў і просіць да сябе некаторых з наведвальнікаў.

Вечар. Галіна Іосіфаўна толькі перасекла Прывакзальную плошчу і ступіла на праспект Леніна. Сустрэчная жанчына неяк сціпла прывіталася. Павіталася і Галіна Іосіфаўна. А потым успомніла сваю першую сустрэчу з гэтай жанчынай. Яна тады вельмі плакала.

— Сына майго пасылаюць на Поўнач. Вучыла-вучыла яго.. І на табе...

— Ды што вы. Ці варта так гараваць...

Але не паспела Галіна Іосіфаўна ўгаварыць жанчыну, як тая перайшла ўжо ў наступленне:

— Сваіх дык не пашлеце туды.

Галіна Іосіфаўна толькі ўсміхнулася і пажадала ёй здароўя. Пазней гэта жанчына, відаць, даведалася, што і Лёнік, сын Галіны Іосіфаўны, сёлета скончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту і таксама паехаў на паўночную чыгунку. Галіна Іосіфаўна яшчэ раз усміхнулася і падумала: трэба напісаць Лёніку. Вельмі ўжо ён турбуецца аб сваёй бабулі, аб Паліне Нікандраўне пытае. А яны жывуць нішто сабе. Алена Іванаўна Ігнацьева — заслужаная настаўніца. На пенсіі яго бабуля, адпачывае. І ў Кавалёвай Паліны Нікандраўны — Героя Сацыялістычнай Працы — справы добрыя: калгас угору ідзе. І дзецьмі яе парадавацца можна. Трэба напісаць Лёніку.

**А. ЗАХАРЭНКА**

г. Гомель.



Перадавая ткачыха Віцебскага дыванова-га камбіната, ударніца камуністычнай працы Ганна Кізікава. За адну гадзіну яна дае 6 квадратных метраў дыванових вырабаў. Гэта самая высокая прадукцыйнасць у свеце.

Фота І. Южыка.

Сяргей ГРАХОЎСКІ

# Лірыка

Яе далоні пахнуць мятай
І спелым жытам валасы.
Шануй, любі, але не кратай
Дзявочай чыстае красы.

І па чужой не мерай мерцы.
Такая толькі ёсць адна,
Калі ў даверлівае сэрца
Табе пастукала яна.

Яе далоні пахнуць мятай
І ныюць ногі ад расы.
Сустрэў, кахаеш, значыць сватай,
Забудзь другія адрасы.

* * *

Ты помніш чэрвеньскія ночы,
Калі глядзелі вочы ў вочы,
Калі звінела цішыня
І мы былі адны да дня!

Блакітны месяц на азёры
Рассыпаў залатыя зоры,
І мы над зорамі плылі,
Пра ўсё забыўшы на зямлі.

Знікалі вербы, і ў тумане
З табою мы плылі, плылі...
Пара настала развітання,
А мы расстацца не маглі.

Спляліся вусны, рукі, вочы
У адным парыве пачуцця.
І сталі чэрвеньскія ночы
Пачаткам новага жыцця.

* * *

Ад сцюжы пасівелі вейкі
І стынуць рукі ад жарствы.
Ты б іх схавала ў рукавы
Сваёй шурпатай целагрэйкі.

Табе здаецца, што не вельмі
Яшчэ лютуюць халады.
Вятры ж гудуць на ўсе лады
І прыстыя к далоні кельма.

Ты мне гаворыш з вышыні,
Што праз гадзіну кончыш змену.
Цябе я, любая, сустрэну,
Калі запаляцца агні.

А ноччу зноў гудзе завея
У нашым ціхім гарадку.
Ты змерзла?.. Я тваю руку
Сваімі вуснамі сагрэю.

Ад шчасця і ад хвалявання
На вейках знікне сівізна,
І чыстай кропляй на світанні
Да нас пастукае вясна.



Ліля Баравіцкая

# НАСТОЙЛІВАСЦЬ

ЦІХА, нібы зачараваная прыгожасцю тутэйшага краю, імчыць удалячынь Ушача. Як глядзець ад Баноні, яна бачна аж да самага лесу, што хавае ад воч Заходнюю Дзвіну. Туды, да вялікай ракі, і коціць свае воды Ушача...

Ліля сядзела на беразе, звесіўшы ногі. Дзесьці ў кустах шастала Зіна, шукаючы кветак. Яны часта прыходзяць сюды. Тут прыемна адпачыць, можна ўволю нагаварыцца аб усім-усім, што толькі прыйдзе ў галаву.

— Зіна, дзе ты? — паклікала сяброўку Ліля.

— Іду, іду...

Зіна прынесла цэлы ахапак розных кветак.

— Навошта столькі?

— Ат, вянкі будзем плесці.

— Ды ты ж не малая ўжо. Не дзіця.

— Ну і што? А я люблю дзяцініцца. Тады забываеш пра ўсё-ўсё на свеце. А ты?

Ліля паціснула плячыма.

— Я так і ведала, — нездаволена заўважыла Зіна Фіялка. — Табе ўсё свінні ў галаве...

Ліля Баравіцкая не пакрыўдзілася, яна думала аб чымсьці сваім. Потым прамовіла:

— Разумееш, не магу ніяк забыць той нарады ў Віцебску.

— Раскажы, гэта цікава...

— Дык вось. Сяджу гэта я ў зале, слухаю, што гавораць людзі. Выступае Ігнатава з саўгаса «Крынкі» і іншыя свінаркі. Усе заяўляюць, што яны перагледзелі ранейшыя абавязацельствы і бяруць новыя. Задумалася, а тут яшчэ Рудаў пачаў падбухторваць: «Выступі і ты». Ну, я і адважылася. Выйшла на трыбуну і кажу: «Бяруся адкарміць 1500 свіней». Сказала і гляджу на Рудава, як ён рэагуе. Аж бачу, ківае галавой наш дырэктар, значыць, усё добра. Вось так адбылося... А цяпер неяк боязна...

— Нялёгка, вядома, будзе, але губляцца нельга.

Баравіцкай раптам прыгадаліся мінулыя дні. Усяго год як прыйшла яна на ферму. Прама са школы. Кволая, нясмелая, ну што тое дзіця была. Свінаркі сустрэлі яе рогатам, а Настасся Бокша нават не ўтрымалася, папракнула:

— Ой, гора маё, сядзела б ты на печы яшчэ. Ці ж па табе работа на ферме?

Ліля змоўчала, хоць было крыўдна. «Сядзела б на печы...» А за кім ёй сядзець? Ні маці, ні бацькі. Адна толькі старэйшая сястра Ніна. Яна глядзела Лілю, выхоўвала. А цяпер самой час зарабляць хлеб.

Працавала Ліля, колькі мела сілы. Мо' больш ад таго, што хацела даказаць жанчынам, на што здатныя маладыя рукі.

— Я вось пра што думаю, — працягвала Ліля. — Нядаўна чытала брашуру пра летнія лагеры для свіней у перадавых гаспадарках. Дык мо' і нам варта зрабіць такія?

Дзяўчаты ўхапіліся за гэтую ідэю, пачалі разважаць. У той жа дзень яны гутарылі з брыгадзірам фермы, заатэхнікам аддзялення. Тыя пачухалі патыліцу і нічога не сказалі.

— Пойдзем у дырэкцыю, — рашылі дзяўчаты.

Паехала ў Ветрына адна Ліля. Яна захапіла з сабою брашуру, у якой падрабязна расказвалася аб лагерным утрыманні свіней. Знайшла Аляксандра Емяльянавіча Рудава, паклала на стол тую брашуру. Дырэктар выслухаў Баравіцкую — і ні слова. Затым паклікаў галоўнага заатэхніка Лаўрыновіча. Пачалі раіцца. Па іх словах выходзіла, што выводзіць адкормачнікаў у лагер няма патрэбы.

Ліля адразу:

— Чаму?

І дырэктар, і галоўны заатэхнік пачалі пераконваць, што гэта быццам патрабуе вялікіх сродкаў і, галоўнае, няма адпаведнага для лагера месца. Давялося запрасіць іх з'ездзіць у Банонь. Там і пераканаліся ўсе, што праўда на баку Баравіцкай.

Летні лагер быў пабудаваны ва ўрочышчы «Сянчане», у двух кіламетрах ад фермы. І сродкі на гэта былі затрачаны невялікія: агарожу зрабілі толькі з трох бакоў, бо побач цякла рэчка Ушача.

... Ішлі дні. У Банонь паплылі розныя дэлегацыі: з суседніх калгасаў, з іншых раёнаў вобласці. Людзі глядзелі на Ліліну гаспадарку і дзівіліся. Гэта ж столькі свіней! Аднойчы дзяўчына пачула за сваёй спіной ціхі шэпт:

— Скажыце, калі ласка, па сакрэту... Адна Баравіцкая даглядае ўсіх свіней ці мо' яшчэ хто-небудзь?

Гэта пытаўся экскурсант. Яму не верылася, каб адзін чалавек мог дагледзець семсот свіней. Ліля насцярожылася: які ж будзе адказ?..

— Адна, ніхто больш не дапамагае, — пачула яна цвёрды жаночы голас.

Дзяўчына азірнулася — гэта казала Настасся Бокша, якая раней таксама не верыла і кпіла з Баравіцкай. На душы ў Лілі стала радасна...

* * *

У клубе бітком народу: хоць дзверы не зачыняй. Ліля сядзіць наперадзе, за сталом, і ўзіраецца ў твары аднавяскоўцаў. Вунь сядзіць брыгадзір свінафермы камуніст Мікалай Селівошка. Побач з ім — свінаркі Тацяна Фіялка, Надзея Лысак, Вера Варахобава, Марыя Сабалеўская. Яны аб чымсьці размаўляюць, раяцца. А дзе ж Зіна? Няўжо няма? Ліля водзіць вачыма па радах, шукае сяброўку. І толькі пасля заўважыла яе на першай лаўцы. Яна пазірала на Лілю і шчыра ўсміхалася.

Але вось устаў сакратар партарганізацыі саўгаса Мікалай Пятровіч Аўдошка.

— Таварышы, прашу ўвагі.

Ліля неяк уся сцялася. А Мікалай Пятровіч чытаў:

«Свінарцы саўгаса «Банонь» Полацкага раёна Баравіцкай Лілі Рыгораўне.

Цэнтральны Камітэт КП Беларусі і Савет Міністраў БССР сардэчна віншуюць Вас з датэрміновым выкананнем прынятых на 1960 год сацыялістычных абавязацельстваў адкарміць 1500 галоў свіней.

Жадаем Вам, Ліля Рыгораўна, добрага здароўя, новых вялікіх поспехаў у выкананні прынятых Вамі абавязацельстваў на трэці год сямігодкі — адкарміць 2000 галоў свіней — і шчасця ў асабістым жыцці.

Сакратар ЦК КП Беларусі К. Мазураў.

Старшыня Савета Міністраў Беларускай ССР Ц. Кісялёў».

Нейкі момант у клубе было ціха-ціха. І раптам усё злілося ў адзіны гул. Ад лёскату чалавечых рук, здавалася, трымцелі шыбы...

Нядаўна Баравіцкая вярнулася з Масквы. Яна ўдзельнічала ў рабоце студзеньскага Пленума ЦК КПСС, слухала прамову М. С. Хрушчова. Палымяныя словы Мікіты Сяргеевіча ўзрушылі дзяўчыну, натхнілі яе на новыя працоўныя поспехі. Цяпер у свінаркі адно жаданне, адно імкненне: выканаць узятае на 1961 год абавязацельства да дня адкрыцця XXII з'езду роднай партыі. І яна даб'ецца свайго. Такія не кідаюць словы на вецер.

В. ЧЫМІРКА

Саўгас «Банонь»
Полацкага раёна.

# *Усе сілы і ўменне — Радзіме!*

Я ДОЎГА думала, як лепш расказаць пра сваю паездку ў Маскву на Пленум ЦК КПСС. Пра тое ж, як Пленум ЦК КПСС абмяркоўваў справы і задачы савецкай вёскі, як рабілі справаздачу прадстаўнікі краёў, абласцей, калгасаў і саўгасаў, як кіраўнікі камуністычных партый савецкіх рэспублік гаварылі не толькі пра свае поспехі, але і пра памылкі, упушчэнні, як М. С. Хрушчоў папраўляў іх, даваў парады — пра ўсё гэта вядома з газет.

Вядома і пра тое, што Пленум адзначыў поспехі, якія дасягнуты ў сельскай гаспадарцы, намеціў вялікія, але пасільныя задачы перад кожнай саюзнай рэспублікай.

З чаго ж пачаць?..

Па-рознаму складваецца жыццё людзей. Але ў кожнага з нас бывае нейкі прамежак часу, калі правяраеш сябе, задумваешся над тым, што ты зрабіў для народа, для светлай будучыні, ці знайшоў у сабе сілы ісці ўперад, ці не заблытаўся ў жыццёвых бурах.

Гэтая мінута наступіла для мяне, калі прыйшло запрашэнне на Пленум, у Маскву. Ці ведаеце, колькі я перадумала тады! Рабочыя саўгаса, дырэктар далі наказ:

— Слухай, Глафіра: партыя і ўрад клічуць цябе на вялікую нараду, як памножыць багацце краіны, упрыгожыць зямлю багатымі плёнамі. Вялікі гонар аказан і табе і ўсім нам! Не страць гэтага гонару.

— Перадай удзельнікам Пленума наша сардэчнае прывітанне і пажадай усім найлепшых працоўных поспехаў у трэцім годзе сямігодкі. Раскажы, што на сто гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў мы атрымалі па 337 цэнтнераў малака і 51 цэнтнеру мяса, у тым ліку свініны 44,5 цэнтнера на сто гектараў ворыва. Надой на карову склаў 3 155 кілаграмаў.

А я — адкуль і смеласць узялася! — гавару:

— Пра ўсё далажу як мае быць, не турбуйцеся!

Вось і Масква! Што ж гэта сэрца так б'ецца, нібы яму цесна ў грудзях? Радасць перапоўніла яго да краёў. Бо і ў думках я ніколі не ўяўляла, што ўбачу Крэмль, буду сядзець у Крамлёўскім палацы, дзе раней сядзелі цары ды іх саветнікі, што мяне ў ліку простых людзей вёскі запросіць Цэнтральны Камітэт партыі на свой пленум. Калі б даведаліся пра гэта нашы бацькі і дзяды, напэўна, не паверылі б, бо іх жа за людзей не лічылі, бо яны за сотню крокаў шапкі здымалі перад «яснавяльможнымі» панамі. А я, простая даярка, удастоілася такога гонару!

На Пленуме я слухала выступленні таварышаў, а ў галаве тоўпіліся думкі: азірнуся навокал, пагляджу, сядзяць кіруючыя работнікі партыі, вучоныя — паважаныя людзі нашай краіны. Сэрцам адчуваю, што ўсе гэтыя людзі адной загартоўкі, мэты якіх — слаўная партыя камуністаў. І побач з імі я, простая даярка, радавы член партыі. Партыя заўсёды аказвае пашану і павагу людзям працы.

А чым жа мы адказваем на гэтую павагу? Перамогамі ў працы! Але не ўсе аднолькава працуем — адны збіраюць вялікія ўраджаі збожжа, кукурузы, шмат надойваюць малака ад кароў, а другія топчуцца на адным месцы, не могуць асіліць дзяржаўнага плана. Чаму?

Па-мойму, таму, што ёсць яшчэ ў нас абыякавыя людзі, якіх не цікавіць заўтрашні дзень. Ім важна толькі адно — мінуў дзень, ну і добра! Іх не турбуе ні мелкае ворыва, ні пустазелле, ні падзеж жывёлы, ні нізкія надоі. А трэба, каб кожны хварэў душой за агульную справу, аддаваў усе сілы і ўменне Радзіме, народу, сваёй працай набліжаў светлую будучыню.

Шмат людзей выступала на Пленуме, рыхтавалася і я, але жадаючых было вельмі многа, немагчыма ўсім прадаставіць слова. Усё-такі, калі б паднялася на трыбуну Пленума, абавязкова расказала б пра абыякавых людзей, якія блытаюцца пад нагамі і перашкаджаюць нам паскорыць крок.

Расказала б і пра сваю работу. Ужо 11 год я даю кароў у саўгасе «Рачкавічы». Памятаю, прыйшла на ферму і здзіўлялася ўвішнасці Ольгі Якубовіч — любая работа ў яе руках кіпела: яна і накорміць кароў раней за ўсіх, і бітоны паспее памыць, і каровы ў яе больш малака даюць. Вось, думаю, жанчына стараецца. Пачала раіцца з ёй, вучыцца і пераканалася, што надоі малака ў многім залежаць ад даярак: будзеш правільна раздойваць, карміць і даглядаць кароў — будзе малако.

Не адразу далося мне ўменне вопытнай даяркі. Шмат год я хадзіла ў «сераднячках» — надойвала па 1500 кілаграмаў. У 1957 годзе надаіла па 3200 кілаграмаў. Крыху адстала ад Якубовіч і вырашыла выклікаць яе на спаборніцтва. Не хачу ўтойваць, дагнаць мне тады яе не ўдалося — надаіла ўсяго па 3859 кілаграмаў.

У наступным, 1959 годзе я, нарэшце, стрымала свае слова. Заняла першае месца ў саўгасе, ад кожнай каровы атрымала па 5275 кілаграмаў малака. Здавалася б, можна адпачыць — усё ўжо заваявана: першае месца, пашана і ордэн Леніна, якім узнагародзілі мяне ў гонар 50-годдзя Міжнароднага жаночага дня. А ўсё ж на душы неспакойна: ведаю, іншыя даяркі надойваюць па 6—7 тысяч ад каровы. Старалася, не шкадавала сілы, часу і надаіла ў другім годзе сямігодкі па 5903 кілаграмы.

За гэта мне прысвоілі ганаровае званне ўдарніка камуністычнай працы. Цяпер уся наша ферма змагаецца за права называцца фермай камуністычнай працы. Даяркі ў нас — усё больш моладзь. Справы кожнага хвалююць усіх. «Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго» — вось наша правіла. Мы дасягнулі ўжо нядрэнных поспехаў. Надой на ферме склаў 4293 кілаграмы ад каровы.

Могуць сказаць, што ў мяне каровы асаблівыя. Сапраўды, я некалькі год даглядаю адну і тую ж групу кароў. Кожны год гадую ад іх па цяляці, а сёлета ад адзінаццаці кароў атрымала трынаццаць цялят, і ўсе здаровенькія.

Па прыкладу Валянціны Гаганавай з новага года я сваіх кароў перадала маладой даярцы Марыі Зяляновай, а сама пачала раздойваць групу нецеляў, якіх рыхтавала на працягу двух месяцаў. Я ведаю, што ў першы год менш надаю малака ад першацёлак, зараблю менш грошай. Але ці толькі ў гэтым шчасце? А справа цяжкая і цікавая. І трэба ж камусьці-небудзь яе рабіць. Я ўпэўнена, што даб'юся добрых поспехаў...

Вось пра гэта ўсё я і расказала б удзельнікам Пленума.

**Г. І. СТАТКЕВІЧ,**
даярка саўгаса «Рачкавічы».

Слуцкі раён.




# ПАДАРУНАК МАЦІ

Міхась ЛЫНЬКОЎ

Малюнкі Э. Гусейнава

**(З цыкла апавяданняў «Іх лад жыцця»)**

*Міхасю ЛЫНЬКОВУ даводзілася не аднойчы бываць у Злучаных Штатах Амерыкі. Там пісьменнік прыглядаўся да жыцця амерыканцаў, вывучаў яго — і як вынік гэтых назіранняў у апошні час з'явілася нізка яго апавяданняў з амерыканскага жыцця. «Падарунак маці» — адно з апавяданняў гэтай нізкі.*

ДА каляд заставалася месяцы са два. Як і ў кожнай амерыканскай сям'і, рыхтаваліся да свята і ў сям'і Элаізы Ройшад. Свята каляд, ці як называюць яго ў Амерыцы — кісмас, гэта час, калі ўсе пасылаюць адзін аднаму найлепшыя пажаданні і падносяць узаемныя падарункі. Падарункі, вядома, могуць быць рознымі. Гэта ўжо ў залежнасці ад матэрыяльных магчымасцей таго, хто дорыць. Улічваюцца, зразумела, і патрэбнасці і тыя ці іншыя густы асобы, якой падносіцца падарунак.

Элаіза Ройшад марыла падарыць свайму жанатаму сыну добры світар і, зразумела, нязменную ў такіх выпадках святочную пляшку віскі. Нявестцы яна думала падарыць модную брошку, а дзвюм малым унучкам па сукенцы і каробцы цукерак. На большае яе сям'я не магла разлічваць, бо маці служыла аперэйтаршай у адным з універсальных магазінаў і зарабляла не так ужо багата, каб рабіць раскошныя падарункі.

Сын таксама думаў пра падарунак маці. Але пра свае падаруначныя планы ён не гаварыў нікому і нават не дзяліўся імі са сваёй жонкай, калі тая спрабавала закінуць слова, другое пра недалёкі кісмас. Ва ўсякім разе яна не забывалася сказаць яму, каб ён дужа не раскашэльваўся на такія справы, бо маці, як-ніяк, і сама зарабляе, ды к таму ж зарабляе крыху больш, чымся сам ён, які займаў невялічкую тэхнічную пасаду на кансервавым заводзе. Сузан надзімаўся ў такіх выпадках і даволі нявetліва адказваў:

— Гэта не твая справа. Ты думай лепш пра падарунак сваёй маці...

— Я ўжо думала, але нічога не магу добрага прыдумаць, бо што я трапнага куплю за тую дробязь, якую даеш ты мне на гэтую справу.

— Ладна. Мы не ракфелеры, каб раскідацца грашмі на розныя глупствы. Гэта раз. А па-другое, не твой клопат пра маю маці. Што падару ёй, то гэта ўжо мая справа.

— А ўсё ж...

— Вось і ўсё ж. А падарунак я зраблю добры. Гэта будзе вялікім сюрпрызам. На тое яна і мая маці, каб я як след шанаваў яе... Кажу, гэта будзе выдатным сюрпрызам...

Жонка нездаволена пачмыхвала носам.

— Вунь дзеці чаравікі пазнасілі, трэба купляць новыя. Вугалю засталося лапаты на тры, а хутка халады...

— Вугалю маці купіць. Яна гаспадыня кватэры...

— Вядома, гаспадыня... Толькі я каторы год хаджу, як апошняя наймічка... Божа мой, божа, пашанцавала мне выйсці замуж у такую сям'ю...

— Ну, ну.

— Што ну-ну? Ты нідзе не затрымаўся на працы больш года, адусюль праганяюць...

— Ніхто мяне не праганяе, я сам звальняюся, бо шукаю лепшага месца...

— Ён шукае лепшага месца?! З рудніка прагналі за п'янства, а добрая была пасада электраманцёра...

— Што ты разумееш? Я і цяпер электраманцёр... А ты хацела б, каб мяне заваліла зямлёй у рудніку. Хіба не памятаеш, як пахавалі разам трыццаць шахцёраў пасля выбуху ў рудніку?

— Не гавары мне пра гэта, бо і ты быў вінаваты ў іх смерці...

— Хіба я забіваў іх?

— Кажуць, была няспраўная праводка, бо ты з-за п'янства не дагледзеў яе...

— Кажуць, кажуць... Ці мала чаго кажуць, а ты толькі слухай...

— Але ж прагналі, за п'янства прагналі... і з гаража прагналі, і з лодачнай майстэрні прагналі... Скажы дзякуй маці, што ўладзіла цябе на працу на гэты завод, тут бы хаця трымаўся...

— Пры чым тут маці?

— Колькі гэта каштавала слёз тваёй маці! Яна выплакала табе гэтую пасаду, ёй абрыдалі вечныя клопаты аб табе... лайдак ты няшчасны...

— Хопіць, разышлася! — і так стукнуў кулаком па стале, што прачнуліся дзеці і адразу ўшчалі такі плач, што муж тут жа, моцна бразнуўшы дзвярмі, падаўся ў другі пакой.

— Вось і схадзілі ў кіно, — падумала жонка, выціраючы няпрошаныя слёзы. — Два дні дамаўляліся, каб схадзіць сям'ёй, як усе добрыя людзі. Дык сходзіш з ім, хіба толькі ў магілу...

Яна пачала супакойваць дзяцей, потым пайшла з імі на вуліцу, каб крыху пазабавіць іх ды разам з тым падзяліцца з суседкамі сваімі крыўдамі і жальбамі.

А Сузан сядзеў у пакоі, як заўсёды, пануры, задумны. Сапраўды, не шанцуе яму ў жыцці. Нябожчык-бацька ў яго гады быў куды шчаслівейшым чалавекам. Ён меў нават свой уласны домік і нядрэнны рахунак у ашчаднай касе. Праўда, маці казала, быў ён вельмі настойлівым і працалюбівым, ніколі не змарнаваў ніводнага дня. Можа яно і праўда. Але што ты возьмеш з тае працы? Ну, вядома, будзеш сыты і апранены... А што з таго? Не такая прыемная ўжо штука, гэтая праца... і так дзень пры дні, дзень пры дні. Вунь некаторыя яго таварышы нідзе не працуюць, а жывуць не блага, ва ўсякім разе лепш, чым усе рабочыя і нават тэхнікі. Праўда, у аднаго багаты бацька, у другога амаль што мільянерша цётка, трэці атрымаў добрую спадчыну і ні аб чым не шманае, акрамя хіба салонаў і рэстаранаў, чацвёрты, пяты... Ёсць хлопцы, што абыходзяцца і без бацькоў. І не працуюць, не націраюць мазалёў, а гуляюць часам так, што ўся акруга грыміць... Усяго хапае ім: і віскі, і французскага каньяку, і прыгожых дзяўчат. Праўда, ім даводзіцца часта мець справу з паліцыяй, некаторыя пабывалі і ў турме... Канешне, гэта не вельмі прыемна... Затое жывуць!

А ён не жыве, а мадзее. Трэба было яшчэ ажаніцца! Гэта ўжо матчын клопат — спадзявалася, што ён пасталее, набярэцца розуму, як яна кажа. Розуму... Хіба ён жыве без розу-

му? Але ж, відаць, гэта праўда. Які ўжо тут розум, калі трэба лічыцца з кожным цэнтам, калі гэтая неадчэпная жонка толькі і ведае, што патрабуе: дай ёй на хлеб, дай на мяса, дай на адзенне... Ён жа не ракфелер які-небудзь! Урэшце і ў яго душа жывая, яшчэ мае і свае патрэбы: ёй трэба і віскі, ёй трэба і цыгарэты, ды ці мала чаго ёй трэба. Шчэ' добра, што гэтая маці... Яна не патрабуе за кватэру, а што б было, калі б давялося яму наймаць кватэру? Аб гэтым цяжка нават падумаць.

Аднак чорствы чалавек гэтая маці. Ёй добра — яна зарабляе больш, чым ён, і гэта на адну душу. Канешне, яна сім-тым дапамагае — і на кватэру і на вугаль, часам і дзецям сёе-тое справіць. А ўсё ж... Магла б і больш раскашэліцца. Як-ніяк, атрымала яна пасля бацькі і страхавыя й невялікую спадчыну, ёсць і ў самой сякія-такія зберажэнні. Неяк собіла яму паглядзець у яе ашчадную кніжку, аж галава закружылася. Яму б тыя грошы, ён даў бы ім рады. Віскі ёй не трэба, цыгарэты не трэба, адно, што на царкву сваю часам патраціцца, дык невялікія то патраты.

Сапраўды, якія патрэбы ў старых? Ні ім модныя ўборы, ні ім забавы... Адно — пад'есці, адпачыць пасля працы і, калі вольная хвіліна, адвесці душу з суседкамі, такімі ж старымі людзьмі, як і сама, перамыць костачкі ўсім блізкім і знаёмым. Канешне, у першую чаргу ў такіх абгаворах дастаецца яму, Сузану. Ён і лайдак, і няўдака, і збэшчаны чалавек, і невядома ў каго пайшоў, у каго ўрадзіўся. Адным словам, адбіўся ад рук, вядома, выхоўваўся без бацькі, а дзе жанчыне ўправіцца з падрастаючымі дзецьмі, каб па-людску паставіць іх на пуць-дарогу.

Можа маці і правая па-свойму, і дзесьці ў глыбіні душы прамільгне на які-небудзь міг нешта падобнае на жаль да маці. Колькі яна перажыла, калі аднойчы ён цяжка хварэў. Усе ночы праседжвала над ім... Ну, а потым, потым... Канешне, хапала ёй не мала праз яго штукі і дурасці ў дзяцінстве, а пазней праз яго розныя глупствы і такія справы, калі маці даводзілася важдацца з паліцыяй, упрошваць яе, ліць слёзы перад ёй. А як жа іначай? На тое ж яна і маці, каб адказваць за яго. Хто ж павінен клапаціцца аб ім, аб яго дабрабыце, аб яго будучыні, як не яна. Відаць, яна забылася на сваё мінулае. Была ж і яна некалі маладой, павінна разумець яго. Ён жа хоча жыць лепей, весялей, каб пазбавіцца той штодзённай нудоты: завод, хатнія непарадкі, згрызоты з жонкай, вечныя думкі аб тым, як дацягнуць да палучкі, апрыклыя спрэчкі з жонкай з-за якой-небудзь пяцёркі долараў, якія ён прапіў з таварышамі. Што значыць прапіў? Ну проста пасядзеў з прыяцелямі, была такая прыемная бяседа... Не піць жа яму заўсёды на чужыя грошы. І так ужо часам насміхаюцца з яго і ўжо не аднойчы пагардліва называлі нікчэмнікам, здольным хіба аблізваць чужыя талеркі. А хіба ў яго няма гонару? Хіба ён не павінен пастаяць за свой гонар, за гонар сваёй фаміліі. А маці не разумее гэтага. І калі ён напрамілуй бог прасіў яе аднойчы даць яму трыццаць долараў, каб аддаць картачны доўг прыяцелям, яна проста паслала падалей і яго і прыяцеляў. Ёй гэта лёгка сказаць, а яму трэба запазычваць вочы ў сабакі, каб сустракацца пасля з таварышамі.

І дзесьці ў тайніках душы асядае, як муць, чорная думка аб тым, што няма нічога вечнага на зямлі, што і маці не міне таго, што наканавана кожнаму чалавеку на зямлі. Вядома, яе зберажэнні нідзе не падзенуцца, яны ж застануцца і па закону пяройдуць да яго. Праўда, ёсць яшчэ замужняя сястра, старэйшая за яго. Яна жыве ў Канадзе. Па закону ён павінен будзе падзяліць тыя здабыткі з ёй, закон ёсць закон. Сузан бярэ кавалачак паперы і скрупулёзна выпісвае лічбу за лічбай. Вось гэта давядзецца аддаць як спадчынны падатак... Гэта дарэмныя патраты, і каб маці ўлічвала ўсё, яна змагла б цяпер аддаць яму гэтыя грошы, якія ён і расходаваў бы, як і належыць паважаючаму сябе чалавеку. Але добра. Закон ёсць закон. І пасля падатку і перадачы сястры яе часткі (ён, зразумела, утрымае з яе выдаткі, звязаныя з пахаваннем маці, і само пахаванне можна зрабіць як мага скромным — мы ж не якія-небудзь ракфелеры) яму застанецца ладны кавалак. Ну, папомняць тады ўсе, хто насміхаўся з яго, абражаў яго. Ён пакажа ім, як трэба паважаць сяброўства, як трэба па-сапраўднаму абыходзіцца з людзьмі, як трэба весяліцца... Канешне, давядзецца сёе-тое патраціць і на сям'ю, нідзе ўжо не дзенешся ад яе. Але хопіць і на іх...

Ад узнёслых мар прыемна кружыцца галава, як ад шклянкі добрага віскі. Не так ужо і кепска жыць на свеце, як гэта здавалася яму ў часе нуднай дыскусіі з жонкай.

— Мы яшчэ пакажам усім! — уголас гаворыць ён, мнучы ў попельніцы недакурак цыгарэты.

— Што ты пакажаш і каму? — чуе ён голас. Ён нездаволена азіраецца назад, на дзверы. Хто гэта выбівае яго з прываблівага свету мар і спадзяванняў?

У дзвярах стаіць маці. У яе посны выраз твару, у бляклых вачах нямое запытанне.

— Гэта я так... — нехаця адказвае ён і, спахапіўшыся, дадае:

— Вось кніжку адну чытаю, — і ляным жэстам паказвае на дэтэктыўную аповесць, разгорнутую перад ім.

— Дык нешта ж уголас? Ізноў, відаць, пасварыўся з жонкай. Нядобра гэта, сынок, нядобра. Яна цярплівая жанчына, трэба толькі здзіўляцца, як яна яшчэ трымаецца ў нас. Я б на яе месцы даўно разышлася б з табой, такім слаўным мужам...

— Кіньце, маці, абрыдла слухаць!..

— Табе слухаць, а мне абрыдла глядзець на цябе і на твае паводзіны.

— А вы і не глядзіце, будзе вам спакайней.

— Ладна, — кінем аб гэтым. Адно, што я хацела б сказаць, каб вы пажылі ў ладзе і спакоі. Хаця б тыя дні, на якія я адлучуся з хаты.

— Куды вы думаеце адлучацца? — механічна перапытаў Сузан, рады ўжо таму, што тэма гутаркі некалькі мяняецца.

— З'езджу да Беці дзён на дзесяць. Я не бачыла яе даўно. Гэта ж ужо дзесяць год мінула, як яна з мужам прыязджала да нас. Тады тваёй пляменніцы, маленькай Караліне было ўсяго шэсць год. Памятаеш, як яна заліла соусам твой святочны касцюм?

— Гм... Чаму ж не памятаць! Тады мне здорава ўляцела ад бацькі за той касцюм. Ён жа не ведаў, што прычынай усяму тая свавольніца, капрызуля, і ўсыпаў мне добрую порцыю гарачых...

— Знайшоў, што ўспамінаць... А цяпер, як бачыш, той свавольніцы праз два тыдні будзе шаснаццаць год. Беці з мужам і запрашаюць мяне на гэтую сямейную ўрачыстасць.

— Як жа ты паедзеш, а служба?

— Фірма згадзілася даць мне на гэты час адпачынак.

— Ну што ж, паязджай, маці. Мяне, нябось, не запрашаюць у госці?

— Паспееш яшчэ з'ездзіць... Мне, старой, не так ужо лёгка выбраць час для паездкі, ды і не люблю я доўгія дарогі...

— Цяпер жа не так ужо дрэнна ў цягніках, за якія суткі — паўтары будзеш і на месцы.

— А я думаю самалётам. І хутчэй і пару дзён сэканомлю.

— Ты ж не ахвотніца лятаць на самалётах. Памятаеш, як у мінулым годзе праклінала адну сваю службовую паездку.

— Гэта не так ужо і страшна. Перасадкі з поезда на поезд — вельмі нудная справа, ды і часу траціцца зашмат.

Яны даволі мірна пагаварылі аб некаторых справах, успомнілі мінулае, калі жывы быў яшчэ бацька, калі маці вяла толькі хатнюю гаспадарку. Успомнілі, што бацька ўсыпаў гарачых сыну не толькі за сапсуты касцюм, але і за дрэнныя поспехі Сузана ў школе, з-за якіх бацьку даводзілася не раз і не два



весці не зусім прыемныя дыскусіі з настаўнікамі. І як бяжыць час: была маленькая Караліна, усяго год чатырнаццаць было Сузану, а цяпер у яго ўжо дзеці, двое дачок... Усё было б так добра, каб не гэтыя сямейныя згрызоты. А з-за чаго? З-за якога-небудзь няшчаснага долара... Ну, гуляе, ну, выпівае часам... Падумаеш, якія страхі! Не мільёны ж прапівае ён...

Маці паволі рыхтавалася да сваёй паездкі. Купляла сякія-такія падарункі дачцы, яе мужу і самы лепшы ўнучцы Караліне. Усе гэтыя дні Сузан хадзіў вясёлы і ўзрушаны. Ён праявіў нават пэўную энергію і заклапочанасць. Схадзіў на аэрадром, прынёс дахаты акуратна выпісаны расклад самалётных рэйсаў да горада, у якім жыла сястра ў Канадзе. Гадзінамі праседжваў вечарамі з маці, выбіраючы сумесна з ёй найбольш зручны для яе рэйс. Дастаў нават карту гэтых рэйсаў. А калі маці згадзілася на адзін рэйс, сам пабыў на аэрадроме і за пяць дзён да адлёту купіў ёй білет. Купіў нават за ўласныя грошы, чым вельмі расчуліў маці, і яна, упершыню за колькі год, пацалавала яго і нават сказала:

— Вось бачыш, ты ж можаш, калі захочаш, быць такім харошым чалавекам... і... добрым сынам...

— Ну што вы, маці... Я заўсёды такі... Калі што і бывае, дык гэта ж выпадковыя з'явы, ці варта звяртаць на іх увагу.

— Вядома, сынок... Магчыма, я часам і памылялася, калі думала аб табе толькі блага...

Яна нават змахнула слязу, першую за апошнія гады слязу радаснага замілавання сваім адзіным сынам.

Сузан хацеў быў сказаць, што ён збіраўся купіць ёй у аўтамаце на аэрадроме спецыяльныя страхавыя полісы. Каштуюць яны вельмі танна, усяго які-небудзь долар ці паўтара, а выплачваюць па іх... здорава выплачваюць... Справа тут пахне тысячамі, калі купіць некалькі полісаў. Але тысячы толькі ў выпадку... Ну, ці будзеш жа гаварыць роднай маці, у якім выпадку выплачваюць тыя тысячы. І ён палічыў, што гаварыць ёй аб такіх справах было б ужо зусім нетактоўна... Ён жа сын, а не хто які іншы. І ён прамаўчаў пра гэтыя полісы, якія каштуюць так танна, так танна...

Апошнія дні перад ад'ездам маці ён хадзіў маўклівы і пануры. Вечарамі корпаўся са старым кішэнным будзільнікам, які застаўся яму ў спадчыну ад бацькі. Разбіраў, збіраў яго. Важдаўся з рознымі батарэйкамі. Маці заўважыла яму:

— Займаешся, сынок, дзіцячымі гульнямі. Ты ж электраманцёр, пры жаданні мог бы мець і некаторую прыватную практыку ў вольны ад службы час.

Ён адказаў ёй спакойна:

— Хачу адрамантаваць бацькаў будзільнік, а то вось часам пазнюся на працу.

— Дык аддаў бы ў майстэрню гадзіннікаў.

— Не бяруць. Кажуць, стары завельмі механізм, у іх няма патрэбных частак.

— Знайшоў жа занятак...

Маці махнула на ўсё рукой. Ці варта залішне сварыцца з сынам перад ад'ездам.

Некаторымі вечарамі сын хадзіў на ўзмор'е і цэлыя гадзіны праводзіў у трысняговых зарасніках, якія цягнуліся на доўгія кіламетры па абодвух берагах балоцістай рачулкі. Што ён рабіў там, ніхто не бачыў і не ведаў. Але з кожным вечарам сын рабіўся больш жвавым, весялейшым. Ён спрабаваў нават жартаваць, заводзіць гульні з маленькімі дочкамі, і ў кватэры ўзнімаўся такі вясёлы гармідар, што жонка толькі здзіўлялася, адкуль гэта ўсё бярэцца, адкуль такія перамены ў яго характары? Яна нават сказала аднойчы:

— Нешта я не разумею цябе.

І ён адказаў ёй ні то сур'ёзна, ні то паўжартам:

— А чаго тут разумець? Мы яшчэ пажывём з табой, вось пабачыш!

— Што я пабачу? І так ужо насміхаюцца з мяне ўсе суседкі.

— 'Шчэ насмяешся і з іх.

— Ці не надумаліся часам павысіць табе зарплату?

— А хіба гэта немагчыма? Не век жа мне хадзіць у электраманцёрах...

Урэшце падышоў і час ад'езду маці. У яе падрыхтавана было ўжо ўсё ў дарогу і яна пачала ўкладваць чамадан.

— Кінь, маці, я дапамагу табе сам зручней запакаваць усе рэчы. Адпачні перад дарогай. Садзіся вось, калі хочаш, і гавары, куды якую рэч класці, што глыбей, што бліжэй.

— Ну ладна, сынок, пакуй, я збегаю яшчэ ў магазін, развітаюся са сваімі калегамі.

У вызначаны час яны выехалі на старэнькім фордзе — таксама спадчына бацькі — на аэрадром. Сын занёс чамадан у багажнае аддзяленне, купіў яшчэ маці бутэльку яе любімай мінеральнай вады. Улучыў хвілінку і ў касавым аддзяленні набыў на дзесяць долараў страхавых полісаў. Калі расплачваўся, рукі дрыжэлі так, што дзяўчына-касірша шчыра параіла яму не хвалявацца — «хто ў першы раз ляціць, той заўсёды хвалюецца, а гэта ж усё так проста, так звычайна...» І надарыла яго такой мілай усмешкай, што другім разам Сузан абавязкова затрымаўся б на якую хвіліну, каб перакінуцца лішнім словам з такой слаўнай дзяўчынай. А тут ён толькі зірнуў на яе незразумелым вокам, потым спахапіўся і, паспешліва засоўваючы ў кішэню полісы, хуценька падаўся прэч.

Каб суняць крыху хваляванне, ён забег яшчэ ў буфет і залпам выпіў стопку віскі. Крыху супакоіўся, перасталі дрыжаць рукі, толькі ў нагах адчувалася такая млявасць, што ён ішоў замаруджаным крокам. Яго штурхалі мітуслівыя пасажыры, ён сам натыкаўся нібы саслепу на сустрэчных людзей, за што яго некалькі раз груба аблаялі. Больш разважлівыя пасажыры, заўважыўшы яго блукаючы позірк, саступалі дарогу, абыходзілі. Маці таксама заўважыла штосьці няладнае ў яго выглядзе, трывожна запыталася:

— Ці здаровы ты, сынок?

— О, зусім здаровы, зусім здаровы... — паспешліва адказаў ён, пазбягаючы зірнуць у вочы маці.

Цень трывогі сышоў з яе твару і яна, ужо сурова асуджаючы, сказала яму:

— А ты ўжо напіўся, як бачу я!

Яна хацела яшчэ нешта сказаць, але тут абвясцілі пасадку на самалёт. Яны правялі яе да выходных дзвярэй, далей якіх іх, як суправаджаючых, не пусцілі. Яны бачылі, як паднялася яна па трапу, як заканчвалі пасадку, як бег задыхаўшыся спазнелы пасажыр, які, мяркуючы па яго расчырванеламу твару, крыху засядзеўся ў буфеце ці рэстаране. І вось урэшце самалёт пайшоў на старт, месца якога не відаць было ад дзвярэй, ля якіх стаялі яны, Сузан з жонкай.

— Паехалі дахаты! Там ужо, відаць, суседка злуе на нас за тое, што так доўга не прыязджаем.

— Нічога, прыгледзіць за дзецьмі, ты ж большыя паслугі робіш ёй тым часам.

І думаючы аб нечым сваім, ён прапанаваў ёй:

— Ведаеш што, Элі...

Яна насцеражылася. Ён упершыню за колькі год іх жыцця назваў яе так, як некалі называў у першыя дні пасля шлюбу.

— Што ты хочаш сказаць мне, Сузі? — мякка перапытала яна.

— Давай зойдзем з табой у рэстаран. Мы наведваем з табой так рэдка і то адны толькі кафетэрыі. А ў рэстаране разам з табой мы былі так даўно, што я нават забыўся, калі.

— А дзеці, яны ж чакаюць...—нерашуча прамовіла Элінора.

— Божа мой, могуць жа яны якую гадзіну пабыць і без нас. А суседка не пакрыўдзіцца, пасядзіць з імі лішні час...

Элінора зірнула дапытліва на мужа. «О, каб ён быў заўсёды такім добрым, ласкавым, як сёння». Падумала якую хвілінку, пагадзілася.

— Ну, што ж, сходзім, Сузі, калі ты гэтага хочаш. Толькі ж рэстаран каштуе грошай!

— Кінь, Элі, гаварыць пра грошы. Не мы для іх, а яны для нас... Урэшце маю я права пачаставаць хоць сёння маю слаўную Элі...

Жонку кранулі гэтыя словы. Гэта ж ён гаварыў так даўным-даўно, можа гадоў пяць таму назад, калі познім вечарам у гарадскім парку ён прызнаўся ёй у каханні.

І яны пайшлі.

Ён доўга, з выглядам добрага знаўцы, выбіраў меню. Раіўся з ёй, якое віно ёй больш да спадобы, каліфарнійскае ці замежнае, французскае. А можа яна хоча што-небудзь больш моцнае?

— Я ніколі не піла французскае... — ціха прызналася яна.

— Ну, добра, французскае, дык французскае...

За сталом Элінора пераканалася, што муж яе сапраўдны гурман. Усё, што ён заказваў, доўга раючыся з афіцыянтам, было наўздзіў смачнае, і яна зразумела, чаму Сузан вельмі часта ўставаў з-за хатняга стала хмуры, незадаволены. Тое, што рыхтавала яна і яго маці, не было такім смачным, як тут. Вядома, справа тут у грошах... Успомніўшы пра грошы, яна не магла не напомніць яму:

— Сузі, ты аднак транжырыш грошы! Можа не трэба...

Ён падаў ёй непрыкметна знак рукой: нязручна ж гаварыць аб такіх рэчах, калі ён раіцца з афіцыянтам, той жа можа падумаць аб іх ліха ведама што...

І яна змоўкла. Кіслы настрой — каму прыемны праводзіны, развітанні? — хутка прайшоў, з кожнай чаркай рабілася весялей. Усё, што было такім шэрым, абыдзенным, нудным, неяк адыходзіла прэч. Жыццё здавалася такім цудоўным, прыгожым, што нават Элі не хацелася ўжо хутка пакідаць гэты ўтульны рэстаран.

Калі Сузан запрасіў яе прайсціся які круг у танцы, яна спачатку запярэчыла, але тут жа згадзілася:

— Ну добра... Раз ты хочаш, я згодна.

Яны прайшліся некалькі кругоў. Як гэта прыемна кінуцца, задыхаўшыся ад танца, у зручнае крэсла і паволі пацягваць кактэйль. Спецыяльны дамскі кактэйль, як кажа Сузі. О, ён вялікі спец на ўсе гэтыя віны, кактэйлі. Канешне, яно было б лепш, каб ён не дужа разбіраўся ў гэтых справах. Але раз ужо гуляць, дык гуляць... Можна, урэшце, хоць раз за некалькі год дазволіць сабе такое...

Ізноў танцавалі, адпачывалі, слухаючы музыку, час ад часу перабіваемую паведамленнямі аб адлёце і прылёце рэйсавых самалётаў. У Эліноры кружылася галава і яна нешта весела гаварыла, не змаўкаючы і смеючыся з Сузана, які завельмі марудна выбіраў марожанае. І ў гэты час яны пачулі паведамленне, якое на кожнага з іх зрабіла рознае ўражанне:

«Самалёт семдзесят пяты, які спазніўся з вылетам на гадзіну з-за дрэннага надвор'я на трасе ў гарах, зараз пайшоў у паветра».

— А мы і не ведалі, што маці яшчэ тут. Мы гуляем з табой, а яна сумавала там у самалёце. Каб ведалі, то і яна пасядзела б з намі, — выпаліла адным махам Элінора, якая была ўжо ў самым добрым настроі і для якой увесь свет цяпер уяўляўся ў самым ружовым святле.

А Сузан чамусьці сядзеў нібы прыбіты да крэсла. Ён многа выпіў, але ап'яненне адразу прайшло і ён тупа глядзеў у акно рэстарана, але нічога не бачыў у ім. Перашкаджалі назойлівыя думкі. Ён толькі сказаў амаль што шэптам: «Божа мой, божа, гэта ж дзве гадзіны...» Элінора перапытала:

— Пра што ты гаворыш, Сузі?

Сузан зрабіў такі рух, нібы папярхнуўся, сударгава схапіў недапітую чарку, асушыў яе. І толькі тады адказаў:

— Я ж гавару, куды гэта варта, калі самалёт спазняецца аж на цэлую гадзіну. Гэта называецца — парадкі...

— А што тут асаблівага, Сузі? Ну, прыляціць маці на гадзіну пазней, і толькі... Падумаеш, такая ўжо бяда, калі твая сястра лішнюю гадзіну прабудзе на аэрадроме, чакаючы маці. Вось мы прасядзелі ўжо тут цэлую гадзіну і не заўважылі, як прайшоў час.

— Кінь верашчаць!— сказаў Сузан і ў голасе яго чуваць былі раздражальныя, злосныя ноткі. — Гэта ж так непрыстойна, на нас глядзяць усе людзі.

Элінора разгублена азірнулася па баках.

— Чаго ты крычыш на мяне! Ніхто не глядзіць на нас.

Сузан наважыўся быў агрызнуцца, але махнуў рукой і, наліўшы адну, другую чаркі, залпам асушыў іх. Элінора пакрыўдзілася:

— Вось ты заўсёды так: на хвілінку здаецца добры, а потым ізноў за старое... Не напіўся яшчэ?

— Ладна выпі і ты... — прымірэнча прамовіў ён і наліў ёй і сабе па чарцы, чокнуўся з ёй.

— А цяпер паехалі! Чаго мы будзем сядзець тут...



Дома ён ізноў зрабіўся панурым, маўклівым. Другім разам пасля такой выпіўкі ён заваліўся б спаць, а цяпер соўдаўся па кватэры, не ведаючы, чым жа яму заняцца, да чаго прыкласці свае рукі. Не раз і не два падыходзіў да радыёпрыёмніка, уключаў яго і тут жа раздражнена выключаў. Шум і грукат джаза, рэкламныя абвесткі так абрыдалі, што хоць ты ўцякай ад іх на край свету. Толькі затрымаўся быў каля прыёмніка на колькі хвілін, калі будаўнічая кампанія рэкламавала продаж гатовых дамоў разам з зямельнымі ўчасткамі ў працяглую растэрміноўку.

— Што ж, гэта нядрэнна...—падумаў ён.— Толькі які купляць — з трох пакояў ці з пяці? У сваім уласным доміку можна будзе пры выпадку заснаваць і сваю электратэхнічную майстэрню... Але прычым тут дом, да д'ябла майстэрні! Хопіць яму і без майстэрні, каб пажыць палюдску, пажыць на славу... Да д'ябла ўсё, да д'ябла ўсе нудныя клопаты...

Знерваваны, спакучаны, ён выйшаў на ганак кватэры, каб падыхаць свежым паветрам. Змяркалася. Па вуліцы, яшчэ не зусім забудаванай, праходзілі рэдкія прахожыя. Яны чамусьці сумна пазіралі на домік, у якім ён жыў. Заўважыўшы яго, некаторыя са знаёмых віталіся з ім і паспешліва ішлі сваёй дарогай. Тут ён заўважыў некаторае ажыўленне ля газетнага кіёска на недалёкім перакрыжаванні вуліц. Чуўся нават гучны голас газетчыка, які выкрыкваў навіны дня, але аб чым ён выкрыкваў, разабрацць было цяжка. Тады ён сышоў з ганка і машынальна павярнуў у бок кіёска. Ён быў ужо недалёка ад яго, калі ясна разабраў словы газетчыка:

— Жахлівая катастрофа ў паветры! Сорак тры ахвяры, сярод іх нашы знаёмыя!

Ногі ў Сузана адразу нібы наліліся свінцом, а сэрца затахкала хутка, хутка, нібы збіралася выскачыць з грудзей. Ён нават спыніўся на хвілінку, каб перадыхнуць, сабрацца з думкамі. Але неадольная сіла ўжо цягнула яго далей — трэба ж урэшце дазнацца, трэба дазнацца...

Ля кіёска тоўпіліся людзі, усхвалявана перачытвалі кароткае паведамленне, якое вылучалася на першай старонцы вялізным шрыфтам. Заўважыўшы яго, людзі папярэдліва расступіліся. Знаёмы кіяскёр абараваў на паўслове свае выкрыкі, разгублена зірнуў на Сузана, потым узяў яго за руку, моцна паціснуў:

— Мы так спачуваем, так спачуваем вашаму гору! Хто б мог ведаць, што такое можа здарыцца. Гэта ж так жахліва...

— Што здарылася?— перапытаў Сузан, адчуваючы, як перасыхае яго горла.

— Божа мой, няўжо вы яшчэ не ведаеце? Калі ласка, вось вам газета...

Рукі ў Сузана трэсліся, калі браў ён газету. Зірнуў на аб'яву. Нібы налітыя крывёй вылучаліся тлустыя радкі аб'явы. Чытаў пятае праз дзесятае: ...усе пасажыры самалёта загінулі, у іх ліку і пяцёра дзяцей, малодшаму з якіх не было яшчэ года... загінуў і экіпаж самалёта і сцюардэса... Ёсць падставы лічыць, што самалёт загінуў ад нейкага выбуху... рэшткі самалёта падалі аж на працягу цэлага кіламетра... Усяго загінула сорак тры чалавекі... Самалёт...

— Які самалёт? — мільганула нецярплівая думка.— Аб чым гэта я? Тут жа ясна сказана: самалёт семдзесят пяты... Загінуў праз гадзіну пасля вылету... Так, так, дзве гадзіны, дзве гадзіны...

Думкі нібы білі цяжкім молатам па мозгу. Цяжка было спыніцца на чым-небудзь. Сэрца білася часта, ніяк не магло супакоіцца. І не разабраць, ці то ад радасці яно, ці ад гора не можа супакоіцца. Ён яшчэ глуха перапытаў, не зварочваючыся ні да кога:

— Хто гэта сказаў, што самалёт загінуў?

— Божа мой, гэта надрукавана ў газеце. Хіба не бачыце самі? — азваўся адзін голас.

— У якой газеце? — механічна перапытаў Сузан.

Людзі, што стаялі бліжэй і чулі яго голас, няўцямна паціналі плячмі. Ён павярнуўся і, не развітаўшыся і не заплаціўшы за газету, паволі пабрыў дахаты.

Некаторыя са стаяўшых ля кіёска людзей сумна заківалі галовамі.

Людзі пагаварылі, разышліся. Нікому не ў радасць чужое гора.

Калі ён зайшоў у хату, там было поўна людзей. Суседзі, знаёмыя прыйшлі выказаць сваё спачуванне, суцешыць у горы. Плакалі жанчыны, дзеці. Элінора скрозь слёзы пачала выгаварваць яму:

— І дзе ты ходзіш? І дзе ты ходзіш? Вось заўсёды так!

І яна гаварыла, гаварыла... Ён і жорсткі чалавек. І няўдзячны сын, колькі турбот мела праз яго маці, праз яго, бяспутніка. І калі толькі возьмецца чалавек за розум...

Ён нічога не адказваў, толькі моцна сцятыя сківіцы гаварылі аб тым, як цяжка яму маўчаць, як цяжка выслухоўваць усе гэтыя абразлівыя выкрыкі. Канешне, у іншы час ён не змаўчаў бы, ён адказаў бы ёй так, што яна месяцамі раскайвалася б у тым, чаму зачапіла яго. А цяпер? Лепш прамаўчаць, няхай супакоіцца, ды і менш будзе крыку, калі не пярэчыць ёй...

На другі дзень газеты прынеслі больш падрабязныя весткі аб гібелі самалёта. Са старонак газет глядзелі здымкі людзей, трапіўшых у катастрофу. Вясёлыя твары, шчаслівыя ўсмешкі дзяцей. І сярод гэтых здымкаў быў здымак і маці. Выраз твару быў сур'ёзны, задуменны. Яна глядзела са старонак газеты і нібы пыталася ў яго, у Сузана:

— Ну як, сынок, ці шкадуеш ты хаця мяне?

Сузан паглядзеў на здымак і, прыкрыўшы яго рукой, перачытаў тэкст рэпартажа. Нічога асаблівага ў параўнанні з учарашнім паведамленнем не было. Праўда, было ўказана месца катастрофы. Яна адбылася непадалёку ад невялічкага гарадка на раўніне ў бязлюднай мясцовасці. Не здымаючы рукі, каб не глядзець больш на маці, ён згарнуў газету і засунуў яе падалей на этажэрку са старымі часопісамі і кнігамі.

Прайшоў тыдзень, другі. Сузан хадзіў на працу. Дома быў не гаваркім, агрызаўся нават на дзяцей, калі тыя спрабавалі лашчыцца да яго. Яны звычайна заходзіліся плачам, і тады Элінора папракала яго:

— Ну чаго ты такі? Чаго ты дзяцей крыўдзіш? Яшчэ называецца бацька... Ну я разумею, гора... Але што ж тут паробіш, ці ж мы хацелі такога няшчасця?

— Хацелі не хацелі... Хопіць. Кінь. Адчапіся...

Яна пацінала плячмі, пакідала яго ў спакоі.

Прайшоў яшчэ адзін тыдзень. Багата передумаў за гэты час Сузан. Уважліва перачытваў святочныя выпускі газет, у якіх звычайна змяшчаліся і спецыяльныя раздзелы па дамаводству, рэкламы на продаж гатовых дамоў з зямельнымі ўчасткамі. Усё прыглядаўся, на чым яму спыніцца, што лепшае выбраць. І ўрэшце яму вельмі спадабаўся ўтульны катэдж на беразе невялічкай рачулкі з крутымі ляснымі берагамі. Цэлымі вечарамі ён сядзеў, падлічваў, намячаў патрэбныя выдаткі. Сродкі ў яго будуць, на ўчастак хопіць. Без яго ўдзелу ўзнікла справа аб укладзе маці ў ашчаднай касе. Туды запрашалі і яго. Справа ўжо амаль што вырашана ў законным парадку. Спадчыну падзеляць між ім і сястрой. Трэба ўрэшце разумней выкарыстаць гэтыя сродкі, пакінуўшы, вядома, і на іншыя свае асабістыя патрэбы — не век жа яму раўняцца на жабракоў. Але колькі яшчэ трэба грошай, каб абставіць свой дом прыстойна, як і належыць паважаючаму сябе чалавеку. Давядзецца збыць старэнькі недалужны фордзік і купіць новую машыну. За стары багата не атрымаеш, але ўсё ж грошы. Божа мой, колькі б іх ні было, а ўсё мала, каб поўнасцю задаволіць чалавека. Некалі ён лічыў бы сябе шчаслівым, каб у яго рукі трапіла хаця б чацвёртая частка матчыных грошай, а цяпер мала і палавіны. І ён успомніў пра купленыя ім страхавыя полісы. Іх цэлых дзесяць, гэта ж некалькі тысяч долараў. Ён тут жа дастаў іх з бумажніка, уважліва прачытаў, падпісаў прозвішчам маці.

Назаўтра ён вылучыў вольную хвіліну на працы і аднёс іх у кантору страхавой кампаніі. Там сустрэлі яго надзвычай ветліва, выказалі яму глыбокае спачуванне ў напаткаўшым няшчасці. Полісы ўзялі і, выдаўшы распіску, сказалі, што выклічуць самі праз некаторы час, бо патрэбны яшчэ некаторыя невялікія фармальнасці.

А праз колькі дзён яго арыштавалі на працы, і калі прывялі яго ў паліцэйскі ўчастак, ён так разгубіўся, што спачатку расплакаўся, потым стаў жаласна выкрыкваць:

— Божа мой, што вы хочаце ад мяне? Я ж ні ў чым не вінаваты...

— Калі не вінаваты, дык чаго ж вам баяцца?

— Гэта не я, гэта не я...

— Аб чым вы хочаце сказаць?

— Не я забіў сваю маці і іх усіх... Не я...

— Гэта, аднак, цікава... Але мы хочам запытаць вас вось аб чым: чаму вы падрабілі подпіс маці на полісах?

«Ах божа мой, гэта толькі полісы, толькі полісы, а я думаў...» — мільганула думка і за яе ўхапіўся Сузан.

— Я не падрабляў подпісы маці, я проста распісаўся за яе, бо яна спяшалася на пасадку і папрасіла падпісаць іх... Гэта можа пацвердзіць і мая жонка... — і тут жа пашкадаваў, што сказаў пра гэта, бо ён жа ні слова не гаварыў жонцы пра полісы.

— Добра, мы гэта праверым...

Яго пакінулі ў паліцыі.

Гэта яго асабліва не ўразіла. Не ўпершыню яму даводзілася знаёміцца з паліцэйскімі парадкамі. Падумаеш, подпісы... Ён жа сам адразу прызнаўся, што падпісаў іх па просьбе маці. Якая гэта падробка? А калі нават і падробка, дык гэта ж не якое-небудзь там вялікае злачынства... Вядома, пакараюць, але ён не дужа ўжо баіцца гэтага пакарання, бо ўсё ж яго чакае лепшае ў жыцці. І гэта лепшае поўнасцю адплоціць яму за ўсе яго мінулыя крыўды, прыніжэнні, нястачы. Канешне, не варта было звязвацца з гэтымі дурацкімі полісамі, як-ніяк, гэта непрыемна. Але ўсё гэта такая дробязь, аб якой не варта і думаць. Ну, патрымаюць, ну могуць пры выпадку і пасадзіць на які год, другі, але ж затое потым ён возьме сваё, ён яшчэ пакажа ўсім, хто ён такі, з ім цяжка будзе жартаваць, у яго ж будуць тысячы і тысячы долараў... Вось толькі дарэмна ён выпаліў з гарачкі, што ён нікога не забіваў... Гэты дурань — паліцэйскі — можа яшчэ падумаць бог ведае што, і собіла ж яму распусціць язык... Аднак глупства гэта. Кожны на яго месцы сказаў бы тое ж самае, калі б яго арыштоўвалі ў такі час, калі здарылася такое... Такое... Сузан не хацеў назваць сваім імем гэтае «такое».

Ён сядзеў і суцяшаў сябе, і будучыня раскрывалася перад ім ва ўсёй сваёй прыгожасці. І новы дом, які аблюбаваў ён, і, магчыма, будучая майстэрня, дзе ён будзе гаспадаром, дзе будуць працаваць на яго некалькі рабочых, а яму застанецца толькі падлічваць прыбыткі. Спачатку майстэрня, а потым можна будзе ўзяцца і за што-небудзь большае...

Находзілі і сумненні, падазрэнні. Чорт паднёс яго з гэтымі полісамі. Пачнуць з іх, 'шчэ чаго добрага, дакапаюцца і да таго... Так жа падвяло гэтае спазненне з адлётам самалёта. Усё ж было разлічана на дзве гадзіны. Усё адбылося б тады над высачэзнымі гарамі. Якраз аніякага б' тады следу. А цяпер вось гэтыя пісакі з газет намякаюць на нейкі выбух... Здарылася ж усё на раўніне, дзе любая драбяза з таго, што было самалётам і яго пасажырамі, застаецца на зямлі, кідаецца ў любое вока. Д'ябал бы іх пабраў з усімі гэтымі парушэннямі графікаў руху. Але ліха на яго... Не такая гэта лёгкая справа дакапацца да нейкай там прычыны... Не варта думаць аб усім гэтым ды псаваць сабе настрой. Усё пройдзе, усё мінецца, застанецца толькі законная спадчына, і яго пальцы адчуюць смак хрупасткіх долараў, за якія можна купіць усё, чаго толькі пажадаеш...

Абнадзейваючыя мары змяніліся пакутлівымі сумненнямі. Раніца прынесла яму жорсткае расчараванне. Яго павялі ізноў на допыт. Ён ужо прыкідваў, як лепш адказваць на ўсе гэтыя пытанні аб полісах. Але пра полісы на гэты раз і не пыталіся. Перад ім палажылі на стале нейкую рэч, крыху падобную на патрон.

Коратка запыталі:

— Вам знаёма гэтая рэч?

Сузан сцяўся ўвесь, пабялеў тварам і, адчуваючы, як дрыжаць яго рукі і неяк раптам перасохла ў горле, ледзь вымавіў два словы:

— Не ведаю...

І дадаў пасля хвіліннай паўзы:

— У першы раз бачу.

— Вы ўпэўнены ў гэтым?

— Так... та-а-к...

— Гэтая рэч знойдзена ў вашым гаражы, чаго ж залішне адпірацца?

— Я крыху слабы на вочы, недабачу... Пакажыце бліжэй, — ён гаварыў, адцягваючы час, каб жа прыдумаць і сказаць нешта такое, што пераканала б іх, што ён тут не пры чым, што гэта нейкае прыкрае непаразуменне, нейкае д'ябальскае насланнё...

— Ну, глядзіце бліжэй!

Яму падсунулі патрон пад самы нос. Ён доўга разглядаў яго, нават паспрабаваў кіпцем налёт зялёнага вокісу на медзі, узважыў патрон на руцэ.

— Так, я цяпер магу сказаць, што гэта такое. Гэта дынамітны патрон. Яго ўжываюць у рудніках, падрываючы пароду.

— Усё гэта правільна. Але чаму апынуўся ён у вашым гаражы?

Пімен ПАНЧАНКА

## У экспрэсе Дэтройт — Чыкага

*(З цыкла вершаў «За акіянам»)*

Нас нясе экспрэсіна ў Чыкага.
Хто чытае комікс, хто жуе.
Нешта смокча фермер з добрай флягі.
Ён, відаць, нішто сабе жыве.

За акном — правінцыя глухая,
На вяроўках сушацца штаны.
Каля станцый некага чакаюць
Рознай масці аўтатабуны.

Ярка прагалёкала рэклама,
Асядлаўшы нейкі там лабаз...
Задрамаў вагон.
Уцёк ад мамы
Хлопчык і кіруецца да нас.

Добры дзень, малы джэнтльмен, гуд монінг!
На назе у хлопчыка званок.
Ён увесь у жаўранкавым звоне,
Кучаравы пастарскі сынок.

Пастар — акулярысты і строгі,
Сочыць за малым з трывогай ён.
Падыходзь, паразмаўляем трохі,
Спадабаўся мне ты, юны Джон.

Не таму, што нагадалі вочы
Сына мне... Не думай гэтак, не!
Проста твой сярэбраны званочак
Закаціўся ў сэрца да мяне.

Я не знаю, што за ён, твой бацька,
Ну а ты — адразу бачу — друг.
Вырастай без планаў забіяцкіх,
Не цурайся нашых чэсных рук.

Многа ў вас такіх, што выюць псамі
І з амвонаў падвываюць псам, —
Ад імя свяшчэннага пісання
Абяцаюць гібель нам і вам.

Б'е ў мазгі ім вадародны вецер,
Сняць яны счарнелыя палі,
Енк дзяцей апошніх на планеце,
Крык апошніх птушак на зямлі...

У калысках спяць пакуль што дзеці,
А ў ракетах дрэмлюць перуны...
Бацька твой нядрэнны — я прыкмеціў, —
Бо з табой яму не да вайны.

Я, здаецца, ўім не памыліўся,
Гэта з-за твайго, малы, званка.
Думай, пастар, думай і маліся
Перш за мір, а потым за сынка.

— Я некалі працаваў на рудніку. Гэта рэч выпадкова засталася ў мяне ў кішэні, ну... і засталася ў гаражы.

— Навошта ж яна была вам патрэбна?

Сузан доўга думаў. Урэшце загаварыў хутка, хутка:

— Бачыце, адзін знаёмы фермер скардзіўся мне, што ў яго на ўчастку вялікія камяні... Я сабіраўся дапамагчы яму, узарваць іх...

— І ўзарвалі?

— Не, што вы? Ён жа застаўся, патрон, цэлым...

— І больш вы не мелі патронаў?

— Вядома...

— А з гэтай рэччу вы знаёмы? — і следчы выняў з шуфлядкі стала рэшткі другога пакарабачанага патрона, а з ім яшчэ некалькі пазеленелых медных аскепкаў.

— Гэта рэшткі ад узарваных патронаў...

— Вашых патронаў?

— Што вы ад мяне хочаце, божа, мой божа! — залементаваў Сузан. — Мяне пыталіся пра полісы, а пры чым тут гэтыя патроны? Пры чым я, зачым гэта? — і Сузан змоўк у істэрычным плачы.

Яму далі вады, супакоілі. І калі найшла на яго поўная абыякавасць да ўсяго, што ён слухаў, аб чым у яго пыталіся, ён пакорна, як авечка, адказваў на пытанні. І аб дынамітных патронах, і аб гэтым праклятым будзільніку. Праўда, ён спрабаваў, хаця даволі вяла, супраціўляцца спачатку з гэтым будзільнікам, але, выслухаўшы, што жонка яго сапраўды расказала аб нейкіх яго практыкаваннях з тым гадзіннікам, адказаў, што такі будзільнік сапраўды быў, але ён недзе выкінуты і ён добра не ведае, дзе ўрэшце ён. Ды і ці варты ён увагі, гэта ж быў сапсуты, такі стары, стары механізм... І яму паказалі тады кавалачак пакарабачанага цыферблата і сказалі, што жонка яго апазнала гэты кавалачак, як рэштку цыферблата былога будзільніка.

— Можа гэта і так... Але ж я кажу, што забыўся, куды выкінуў тое ламачча...

І яму напомнілі, што рэшткі будзільніка, які быў часткай самаробнай бомбы, былі там жа, дзе і рэшткі дынамітных патронаў, дзе і рэшткі ад загінуўшага самалёта.

Сузану засталося адно: маўчаць. Ён сядзеў ссутулены і паціраў лоб, нібы сілячыся ўспомніць, як жа гэта ўсё адбылося. Думкі мітусіліся, усё ніяк не маглі сабрацца да парадку. І толькі адна думка была яснай, акрэсленай: не бачыць яму, як воч сваіх, запаветных долараў. І ці толькі долараў?

Быў суд. Сузану далі належную кару за яго шчыры падарунак маці. Увесь час — і калі быў суд і калі сядзеў ён у турме, ён быў панурым, маўклівым. Ён не захацеў нават пабачыцца перад апошнім часам сваім з сям'ёй, з былымі прыяцелямі. І тады, калі прапанавалі яму гэтую сустрэчу, ён катэгарычна адмовіўся:

— Мне нічога не трэба, нічога не трэба... Не, не... нічога...

І толькі тады, калі падвялі яго да дзвярэй газавай камеры, ён стаў сударгава ўпірацца нагамі і нема закрычаў на ўсю турму:

— Зачым? Я не хачу! Не трэба! Я нічога не зрабіў вам дрэннага... Я хацеў толькі долараў, толькі долараў...

Гэты крык паволі заміраў за жалезнымі дзвярмі камеры.



## У нашых сяброў

Кіль Хак Сіль працуе на шаўкаткацкай фабрыцы ў Пхеньяне, дзе яна ўзначальвае адну з брыгад «Крылатых скакуноў». У адзін цудоўны дзень яна перайшла на работу ў брыгаду з даволі нізкімі вытворчымі паказчыкамі, каб дабіцца павышэння прадукцыйнасці яе працы. Пачуцці, якія схілілі Кіль Хак Сіль да такога ўчынку, засланілі перспектыву немінучага памяншэння яе заробтку. Адстаўшая брыгада хутка нагнала ўпушчанае і заваявала званне «Крылатых скакуноў», а Кіль Хак Сіль у другі раз узначаліла адстаючую брыгаду.

Гэтае імкненне ставіць інтарэсы калектыву вышэй за свае ўласныя, патрэба працаваць з нязменна ўзрастаючым энтузіязмам з'яўляюцца характэрнай рысай усіх працоўных — у тым ліку і жанчын — Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі.

Якая розніца паміж жыццём, пражытым намі, і жыццём нашых дзяцей. На прыкладзе свайго ўласнага жыцця я магу меркаваць аб зменах, якія адбыліся пасля стварэння Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Мая маці працавала служанкай, і нашы мізэрныя сродкі не дазвалялі мне вучыцца. Пасля заканчэння вайны я здолела нагнаць упушчанае: здала экзамены на ступень бакалаўра, праслухала курс рабоча-сялянскага ўніверсітэта і атрымала дзяржаўны дыплом эканаміста. Мне не толькі не прыйшлося плаціць за вучобу, але я яшчэ атрымлівала стыпендыю, якая дазволіла мне зводзіць канцы з канцамі. Я вельмі шчаслівая, што жыву ў такой дзяржаве.

**Крыстэль ШУХАРД**

**Да 15-годдзя вызвалення Венгрыі пісьменніца Клара Фехер у артыкуле «Няхай памятаюць мае дзеці» выкарыстала пісьмо венгерскай жанчыны-маці. Вось некалькі радкоў з пісьма:**

**«Праз сем год пасля вызвалення я стала інжынерам. Я, дзіця былой жабрачкі, атрымала дыплом у прыбранай кветкамі актавай зале ўніверсітэта. Тады ўжо ў мяне быў жаніх — таварыш па курсу, які з землякопа стаў інжынерам-будаўніком.**

**Мы з мужам абодва інжынеры. Муж мой праектуе электрастанцыі, я — жылыя пасёлкі.**

**На маім пісьмовым стале стаіць маленькая лямпа. Дома ў мяне цёпла, работа для мяне — радасць. Але мне хочацца напісаць: няхай памятаюць мае дзеці — дабрабыт, мір, свабода не растуць на дрэве цудоўнымі пладамі, і не бог іх пасылае з неба. Свабода, радасная праца, справядлівасць нараджаюцца ў цяжкай барацьбе народа, з ахвяр лепшых з лепшых. Велізарнай, напружанай працай ствараецца камуністычнае грамадства.**

**Так, будаваць яго, глядзець у будучыню, але не забываць пра мінулае!**

**Пятнаццаць год назад я была неадукаванай, нікчэмнай, няшчаснай служанкай у змучаным, разбураным горадзе. Зараз у мяне сям'я, я — інжынер. Я жыву ў мілай сэрцу будуючайся сталіцы.**

**Не, ніколі нельга пра гэта забываць...»**



Бяспраўнасць, непісьменнасць і прыгнечанне кітайскай жанчыны канулі ў вечнасць. Творчыя пошукі, смеласць і натхненне, з якімі народ будуе сацыялізм,—неад'емныя рысы нашых дарагіх кітайскіх сясцёр. На фота вы бачыце Гераіню працы тэкстыльшчыцу Хэ Цзянь-сю (у цэнтры), якая два гады назад стала студэнткай тэкстыльнага інстытута ў Шанхаі.



# СВЯТА ВЯСНЫ, РАД

Аляксандра УС

НАБЛІЖАЕЦЦА 8 сакавіка — Міжнародны жаночы дзень. У нашай краіне яго адзначаюць як вялікае свята. Сустракаючыся са знаёмым, з сябрам, мы віншуем адзін аднаго і выказваем свае лепшыя пажаданні. Так, гэтае свята трывала ўвайшло ў наша жыццё, яно з'яўляецца падарункам, данінай павагі нашым працавітым жанчынам.



Птушніца саўгаса «Вішнёўка» Мінскага раёна Зінаіда Антонаўна Герын. У мінулым годзе яна выгадавала звыш 30 тысяч птушак.



Свінарка-тысячніца саўгаса «Дрысенскі» Віцебскай вобласці Ольга Іванаўна Хвосцікава.

Цяпер гэта сапраўднае свята, а калісьці ў нашай краіне дзень 8 сакавіка быў днём мабілізацыі рэвалюцыйных сіл, прабуджэння свядомасці жанчын, барацьбы з царызмам за сваё разняволенне. У капіталістычных краінах 8 сакавіка і сёння з'яўляецца днём барацьбы многамільённых жаночых мас за палітычныя і эканамічныя правы, за жыццё, вартае чалавека, за мір на зямлі.

У абстаноўцы выдатных поспехаў, дасягнутых у барацьбе за датэрміновае выкананне сямігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі, адзначаць у гэтым годзе савецкія людзі Міжнародны жаночы дзень. Мы ганарымся, што ў дасягненні гэтых перамог актыўны ўдзел прымаюць жанчыны.

Выкарыстоўваючы сваё права на працу, савецкія жанчыны адыгрываюць велізарную ролю на самых розных участках народнай гаспадаркі і культуры. Усяму свету цяпер вядомы выдатныя дасягненні савецкага народа ў галіке адукацыі. У нас больш 13,5 мільёна чалавек з вышэйшай і незакончанай вышэйшай і спецыяльнай сярэдняй адукацыяй. Сярод спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у нас 52 працэнты жанчын. Як бы буржуазныя дзеячы ні расхвальвалі капіталістычны лад, але назваць такую краіну, дзе палавіну навучэнцаў у вышэйшых і сярэдніх навучальных установах складаюць жанчыны, яны не могуць. Такой капіталістычнай краіны няма!

Савецкія жанчыны — фізікі, матэматыкі, інжынеры актыўна ўдзельнічаюць у будаўніцтве гіганцкіх электрастанцый, у стварэнні рэактыўных рухавікоў, водзяць караблі па морах і акіянах. Сацыялістычны лад забяспечвае жанчынам магчымасць развіваць свае таленты і здольнасці. У галіне навукі і тэхнікі, літаратуры і мастацтва прысуджаны ленінскія і сталінскія прэміі 749 жанчынам.

Капітан далёкага плавання камандзір судна «Новікаў-Прыбой» Валянціна Якаўлеўна Орлікава — Герой Сацыялістычнай Працы. Яна ва ўсім Мурманскім тралавым флоце па праву лічыцца адным з самых вопытных маракоў. Звыш 20 год жыцця Валянціна Якаўлеўна аддала нялёгкай прафесіі марака.

Лётчык - выпрабавальнік! Аб гэтых людзях мы гаворым з захапленнем. Аказваецца, і гэтая прафесія падуладна жанчынам. Палкоўнік Ніна Іванаўна Русакова — пакуль што адзіная ў свеце лётчыца-выпрабавальнік! Каля трыццаці год яна водзіць самалёты. За гэты час Ніна Іванаўна прабыла ў паветры дзве з паловай тысячы гадзін, выпрабоўваючы новыя машыны і іх абсталя-

# ..., РАДАСЦІ, ПЕРАМОГ

Аляксандра УС

...ванне. Гэтай адважнай савецкай жанчыне — маці двух дарослых сыноў прысвоена званне заслужанага лётчыка-выпрабавальніка СССР.

Вось дзве найбольш складаныя, незвычайныя для жанчын прафесіі. І цяжка назваць такую прафесію, якой бы не авалодала савецкая жанчына. У Савецкім Саюзе амаль 30 працэнтаў суддзяў — жанчыны. Больш 40 працэнтаў аграномаў і заатэхнікаў — таксама жанчыны. У нашай рэспубліцы, былой царскай ускраіне, дзе па перапісу 1897 года налічвалася ўсяго тры працэнты пісьменных жанчын, цяпер з агульнага ліку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй жанчыны складаюць 53 працэнты і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй — 66 працэнтаў. Удумайцеся, дарагія чытачы, у гэтыя лічбы!



Даярка калгаса «17 верасня» Пліскага раёна Віцебскай вобласці Галіна Антонаўна Высоцкая надаіла па 4982 кг малака ад каровы.



Свінарка-тысячніца саўгаса «Палота» Віцебскай вобласці Галіна Аляксандраўна Лагунова.

Жанчына-металург! Калісьці гэта было неверагодна. А цяпер — нашто далёка шукаць — завітайце на Мінскі мотавелазавод і паглядзіце, як працуе галоўны металург Тацяна Якаўлеўна Мянжынская. У канструктарскім бюро завода паточных ліній вы сустрэнецеся з кіраўніком яго Антонавай Маргарытай Георгіеўнай. А ў асяроддзі вучоных добра вядома прафесар-біёлаг Лідзія Сямёнаўна Чаркасава, дактары навук — гісторык Ніна Васільеўна Каменская, мовазнаўца Марыя Андрэеўна Жыдовіч і многія іншыя. На кіруючай партыйнай, савецкай і прафсаюзнай рабоце таксама занята многа жанчын. Яны працуюць сакратарамі райкомаў партыі, намеснікамі міністраў, намеснікамі старшыні саўнаргаса, узначальваюць упраўленні, працуюць галоўнымі інжынерамі на буйных прадпрыемствах.

У нашай краіне тысячы прадпрыемстваў, брыгад змагаюцца за званне калектываў камуністычнай працы. Шмат паслядоўніц Валянціны Гаганавай ёсць і ў нашай рэспубліцы. Сацыялістычны лад, вызваліўшы людзей ад эксплуатацыі, стварыў умовы для масавага працоўнага гераізму.

За высокія паказчыкі ў працы 57 жанчын Беларусі ўдастоены высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы і 27 457 жанчын узнагароджаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза.

Калгасны лад адкрыў перад жанчынамі-сялянкамі шырокія магчымасці атрымання адукацыі, авалодання новымі складанымі прафесіямі. Праца жанчыны-сялянкі акружана пашанай і павагай. Некалькім жанчынам-калгасніцам, якія асабліва вызначыліся, двойчы прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. У сёлах, дзе нарадзіліся гэтыя цудоўныя жанчыны, устанаўліваюцца бронзавыя бюсты. Яны будуць стаяць вякі і заклікаць людзей на працоўныя подзвігі.

Самыя важныя, самыя ганаровыя абавязкі — выхаванне падрастаючага пакалення і ахова здароўя насельніцтва нашай краіны — амаль цалкам перададзены ў рукі жанчын. Сярод педагогаў і культурна-асветных работ-

(Заканчэнне на 14 стар.)

## ПІСЬМЫ З-ЗА МЯЖЫ

**Да гэтага часу я не атрымала работы, якая мне так патрэбна. Бачыце, як цяжка з работай у маёй краіне. Узрост — немалаважны факт. Пасля 30 год вельмі цяжка знайсці работу, калі ты не можаш за свае грошы адкрыць якое-небудзь прадпрыемства.**

**Д. К., Бразілія**

Я думаю, што большасць англічан прызнае, што Расія ідзе ўперадзе нас. У нас проста няма тых пераваг, якія ёсць у вас, і да таго ж у нас такія падаткі! Што за сэнс шмат працаваць, калі ўсё ідзе на падаходны падатак? Дзеля чаго старацца працаваць? І што мы можам зрабіць з гэтым? Нічога! Напэўна, многія з нас эмігравалі б у Расію, калі б гэта было магчыма. У нас увесь час адбываюцца забастоўкі — забастоўкі на шахтах, на чыгунках, на суднах, таму што рабочыя нездаволены. Мы думаем, як страшна нараджаць дзяцей у такім свеце...

Кошт жыцця ўвесь час расце, расце і расце. Мы ніяк не можам зразумець, куды ідуць грошы, таму што на будаўніцтва бальніц і на пабудову дамоў замест старых, разбураных, пабудаваных у час Дыкенса, у іх грошай няма. Месц у бальніцы ў нас не хапае: каб зрабіць аперацыю, прыходзіцца чакаць па 2 гады, таму што ў бальніцу на аперацыі запісана вялікая чарга.

**Э. Г., Англія.**



Дэлегацыя англійскіх жанчын на прыёме ў Камітэце савецкіх жанчын.

**На самай справе ў вашай краіне кватэрная плата вельмі нізкая. Мы за месяц плацім 18 000 франкаў плюс ацяпленне, вада, газ, электрычнасць і падаткі. Сярэдні рабочы зарабляе каля 40 000 франкаў у месяц. На жыццё яму застаецца вельмі мала. Падаткі не перастаюць расці і, каб палепшыць сваё жыццё, трэба працаваць па 11 гадзін у дзень.**

**К. Л., Францыя**

Пасля другой сусветнай вайны ЗША пачалі лічыць сябе найдасканалейшай першай дзяржавай, таму што толькі наша краіна не падвяргалася разбурэнню і пакутам. СССР не толькі хутка аднавіў разбураную гаспадарку, але і таксама хутка рушыў наперад у галіне адукацыі, навукі і мастацтва. Таму ЗША адчулі сябе прыніжанымі і спалоханымі. Калі хто-небудзь адстае або баіцца, каб яго не абагналі, ён пачынае хваліцца тым, чаго ў яго няма. Нашым людзям так часта гавораць, што яны самыя разумныя, самыя прагрэсіўныя, самыя дужыя, што яны перастаюць думаць і аналізаваць. Калі хто-небудзь пачынае гаварыць аб тым, што мы выпускаем вельмі многа непатрэбных рэчаў, якія не прадаюцца, замест таго, каб займацца адукацыяй грамадзян, тады яго называюць антыпатрыётам і антыамерыканцам. Я люблю сваю краіну, але гэта не значыць, што я не заўважаю яе памылак.

Асабліва мне падабаецца, што ў СССР жанчыны атрымліваюць такія вялікія магчымасці. У нас таксама ёсць жанчыны, якія займаюцца інтэлектуальнай працай, але ў працэнтных адносінах іх нямнога. У нас ёсць жанчыны-ўрачы, юрысты, але гэта хутчэй выключэнне, чым правіла...

**М. М., ЗША.**



Актывісткі калгаса — Марыя Міхайлаўна Цітарэнка, Аляксандра Яфімаўна Вашчанка і старшыня жонсавета Дзіна Паўлаўна Башлакова.

# Добрыя справы жонсавета

Дзіна Паўлаўна вярнулася з раёна ўсхваляванай. Яна разам з іншымі дэлегаткамі калгаса «Чырвоны шлях» прысутнічала на першым з'ездзе жанчын раёна. На з'ездзе шмат гаварылі пра работу сярод жанчын. Тут яна зразумела, як многа трэба папрацаваць і ёй, як камуністу, сярод калгасніц іх арцелі.

Сход аднадушна выбраў у склад жонсавета Дзіну Паўлаўну Башлакову, агранома элітнай гаспадаркі арцелі, звенявую Ганну Захараўну Лямцаву, у якой на грудзях красуецца ордэн Леніна, лепшую даярку Кацярыну Ільюшчанку. Усяго ў склад савета выбралі 7 чалавек, а яго старшынёй — Дзіну Паўлаўну. Жанчына яна справядлівая, заўсёды стараецца быць з людзьмі. Нездарма калгасніцы просяць у яе парады, расказваюць аб сваіх справах. І Дзіна Паўлаўна заўсёды дапаможа людзям.

Прайшло нямнога часу. Члены савета прыцягнулі да грамадскай работы 15 жанчын калгаса. Абапіраючыся на гэты актыў, жонсавет вядзе шырокую масавую работу з калгасніцамі.

Жанчыны ўзялі шэфства над дзіцячымі яслямі. Раней тут былі некаторыя непаладкі. Дзецям давалі нясмачную ежу. На савет запрасілі повара, нянек, а таксама старшыню калгаса. Неўзабаве ў яслі паступілі неабходныя прадукты, а меню пачалі складаць загадзя.

— Аднойчы зайшла я ў яслі, — расказвае актывістка Аляксандра Яфімаўна Вашчанка, — а дзеці якраз абедалі. Не хочуць есці, раскідваюць кашу па стале. Думала, каша дрэнна прыгатавана. Пакаштавала, не. Каша добрая. Тады я падсела да малых і пытаю ў аднаго: — «Толік, кім ты хочаш быць?» — «Лётчыкам», — адказвае. — «Э, не будзе з цябе лётчыка, ты дрэнна ясі. Вунь Саша глядзі, як есць. Ён здаровы і будзе лётчыкам». Глядзяць няні, а іх выхаванцы навыперадкі пачалі ачышчаць талеркі.

А неўзабаве за дапамогай да жонсавета звярнуліся і няні. Некаторыя маці прыносілі дзяцей у яслі бруднымі, дрэнна апранутымі. Пагутарылі з імі члены савета, і справы пайшлі лепш.

Раней часта можна было бачыць вечарам каля клуба, а то і ў клубе школьнікаў. Жонсавет накіраваў у школу, дзе праходзіў бацькоўскі сход, сваю актывістку Марыю Міхайлаўну Цітарэнка. Яна і дырэктар школы Я. Е. Русакоў, ён жа і парторг калгаса, звярнулі ўвагу бацькоў на гэта.

Многа займаецца жаночы савет бытавымі пытаннямі. Ён павёў рашучую барацьбу з перажыткамі мінулага, п'янствам.

Некаторыя калгаснікі сталі папракаць жонак за тое, што яны ўдзельнічаюць у мастацкай самадзейнасці і выязджаюць з канцэртамі ў іншыя населеныя пункты. Занадта «строгія» мужы пачалі напівацца і ўчыняць скандалы. Іх запрасілі ў праўленне калгаса, дзе засядаў жонсавет, і рэзка пакрытыкавалі за адсталыя погляды. І мужчыны далі слова больш такога не паўтараць.

У калгасе нямала перадавікоў сямігодкі. Славяцца далёка за межамі калгаса сваімі працоўнымі справамі птушніца Лідзія Кекелева, свінарка Зінаіда Мажаева, даяркі Кацярына Ільюшчанка, Варвара Цітарэнка, звенявая Ніна Емяльянчыкава і многія іншыя. Гэта яны, калгасныя перадавікі, абганяюць час, перавыконваючы заданні сямігодкі. І ім дапамагае жонсавет.

Нядаўна па ініцыятыве жонсавета быў праведзен вечар ушанавання жанчын-працаўніц. Калгаснікі віншавалі лепшых і старэйшых працаўніц: Лукер'ю Іванаўну Емяльянчыкаву, Ганну Захараўну Лямцаву, Ніну Піліпаўну Емяльянчыкаву, Кацярыну Сцяпанаўну Ільюшчанку і іншых. У большасці з іх на грудзях ззялі ордэны і медалі — адзнакі іх клапатлівай працы.

Жаночы савет наладжвае чыткі лекцый і дакладаў сярод жанчын. А нядаўна вырашылі сіламі калгасніц падрыхтаваць вялікі канцэрт. У ім будзе ўдзельнічаць не толькі моладзь, але і старэйшыя калгасніцы.

Па ініцыятыве жонсавета восенню вуліцы калгаса абсадзілі дэкаратыўнымі дрэўцамі, прывялі ў парадак калгасны парк. Вуліцы і двары калгаснікаў цяпер заўсёды чыстыя.

Добрую справу робіць жаночы савет у калгасе. Усе яго намаганні накіраваны на тое, каб зрабіць жыццё калгаснага сяла яшчэ больш культурным і прыгожым.

**В. ГАЛЕЕЎ**

г. п. Уваравічы.

# *СВЯТА ВЯСНЫ, РАДАСЦІ, ПЕРАМОГ*

(Заканчэнне)

нікаў з вышэйшай адукацыяй жанчыны складаюць 65 працэнтаў, а сярод урачоў — 75 працэнтаў.

Жанчына — дзяржаўны і грамадскі дзеяч! Гэта звычайная з'ява ў нашай краіне. Разам з мужчынамі яны вырашаюць важнейшыя дзяржаўныя справы. Савецкая ўлада стварыла для жанчын не толькі магчымасць атрымання адукацыі, спецыяльнасці. Яна шырока адчыніла перад імі дзверы ў свет палітычнага і грамадскага жыцця. 15 сваіх лепшых дачок беларускі народ абраў дэпутатамі Вярхоўнага Савета СССР. 149 жанчын абраны ў Вярхоўны Савет нашай рэспублікі. Намеснікамі Старшыні Вярхоўнага Савета БССР абраны інжынер Мінскага камвольнага камбіната Дзмітровіч Алена Міхайлаўна і прафсаюзны работнік Чагіна Елізавета Пятроўна.

Прадметам вялікіх клопатаў партыі і ўрада з'яўляюцца мацярынства і дзяцінства ў нашай краіне. У нас з самай вялікай павагай вымаўляецца слова «маці». Працу жанчыны па выхаванню дзяцей высока ацэньвае наша Радзіма. Мільёны жанчын узнагароджаны ордэнамі і медалямі мацярынства. Толькі па нашай рэспубліцы 2316 жанчынам прысвоена высокае званне «Маці-гераіня». Звыш 251 тысячы жанчын-маці ўзнагароджана ордэнамі і медалямі мацярынства. Наша родная дзяржава аказвае вялікую дапамогу ў выхаванні дзяцей. Толькі па мнагадзетнасці жанчынам Беларусі штогод выплачваецца каля 140 мільёнаў рублёў.

З кожным годам расшыраецца сетка дзіцячых устаноў у краіне. Школы, дзіцячыя сады і яслі, школы-інтэрнаты, групы падоўжанага дня пры школах — усё гэта дапамагае жанчынам-маці ў выхаванні дзяцей. Разумны і здаровы адпачынак маюць нашы дзеці летам. У санаторыях, піянерскіх лагерах, лясных школах, у падарожжах па роднай краіне ўмацоўваюць сваё здароўе штогод звыш сямі мільёнаў дзяцей.

Савецкія жанчыны вельмі ганарацца тым, што наша дзяржава на чале з Мікітам Сяргеевічам Хрушчовым пракладвае дарогу да ўсеагульнага міру. Вялікі ўдзел у рабоце Міжнароднай дэмакратычнай федэрацыі жанчын прымаюць савецкія жанчыны. Федэрацыя накіроўвае агульнае імкненне жанчын ўсяго свету да ўстанаўлення трывалага міру на зямлі. Яна згуртоўвае іх на барацьбу за свае правы і жыццё, вартае чалавека. На сваіх сесіях, кангрэсах, розных міжнародных сустрэчах Федэрацыя заклікае жанчын быць у першых радах барацьбітоў за мір і бяспеку народаў. На працягу ўсяго свайго існавання МДФЖ выступае за забарону атамнай і вадароднай зброі.

Савецкія жанчыны добра разумеюць, што міру не чакаюць, за яго трэба змагацца, не пакладаючы рук, умацоўваць магутнасць сваёй Радзімы. Савецкія жанчыны ўносяць вялікі ўклад у дзейнасць Міжнароднай дэмакратычнай федэрацыі жанчын. Мы будзем яшчэ з большай сілай выступаць у абарону народаў, што змагаюцца за свае правы, за нацыянальную незалежнасць, за свабоду і дэмакратыю, мы будзем змагацца за мір і дружбу паміж народамі. Мы будзем рабіць усё, каб нам і нашым дзецям заўсёды спадарожнічалі мір, дружба і шчасце.

# Няма шэрых дзён

*Як жывуць, як працуюць жанчыны брацкіх рэспублік, што ў іх новага — гэтыя пытанні, безумоўна, цікавяць нашых чытачоў. У нарысе Бірутэ Мацканітэ «Няма шэрых дзён» мы расказваем аб перадавых жанчынах Літоўскай рэспублікі.*

Мне ўспамінаюцца вершы маладой літоўскай паэтэсы Яніны Дзегутытэ:

Не вер, што бываюць
шэрыя дні,
Толькі людзі бываюць
шэрыя...

Успамінаюцца гэтыя вершы, можа быць, таму, што і Яніну Дзегутытэ, агонь таленту якой іскрыцца ў кожным радку яе вершаў, партыя і ўрад ацэнілі гэтак жа высока, як і тых, якіх мы наведалі. А можа быць, таму, што вырашылі мы ўбачыць гэтых слаўных жанчын іменна ў «шэрыя» — звычайныя дні — не тады, калі з рук у рукі перадаецца газета са спісам узнагароджаных і гераінь хвалююць віншаванні сяброў. Не, мы хацелі сустрэць іх у самы звычайны дзень.

* * *

...Ордэнам Леніна ўзнагароджаны тынкоўшчыца Каунаскага раёна Ізабела Абраускене, свінарка калгаса «Савецкі сцяг» Пауліна Багданайтэ, прасаўшчыца каунаскага завода «Метал» Апаліна Стадалнінкайтэ...

Спіс вялікі — усіх не наведаеш.

...Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга — начальнік Прэнайскага ўпраўлення будаўніцтва Она Адамайтэне, ордэнам «Знак Пашаны» — загадчыца сельскай бальніцы ў Панемуне — Алена Тэкарэне.

Едзем да сельскага ўрача.

Ніжняя Панемуне... За вокнамі бальніцы, скрозь галіны стогадовых дубоў і клёнаў відаць Нёман. Цяпер хараство пейзажу хаваецца за заслонай туману, але як прыгожа тут павінна быць летам... Толькі ўнутры, у белых кабінетах і палатах, поры года нічога не змяняюць — палаты заўсёды поўныя клопатаў, болю і надзей. Іменна тут прабягаюць дні Алены Тэкарэне.

Заўсёды і з усімі яна простая, мілая, свая. Можа быць, таму людзі шукаюць у ёй не толькі ўрача, але і дарадчыцу. Прыходзіць жанчына, пачынае скардзіцца на боль у сэрцы, потым разгаворыцца і аказваецца, што гэты боль — чыстае глупства. Горш, што муж п'е, або вось дачка пачала занадта часта на танцы бегаць. І хоць за белымі дзвярыма чакае яшчэ па крайняй меры дзесяць наведвальнікаў, нельга адпусціць гэтую жанчыну без суцяшэння.

Бягуць дні ўрача, прыносячы з сабой усё новыя і новыя клопаты, поўныя падзякі погляды хворых. Часта дораць яны для Панемуне новага жыхара, які гучным крыкам заяўляе аб сваім прыходзе. Гэтыя дні бываюць самыя радасныя, таму што больш за ўсё на свеце Тэкарэне любіць дзяцей. Раней яе спецыяльнасцю былі дзіцячыя хваробы, яна адмовілася ад гэтай работы толькі пасля вайны.

Чаму? Пачынаючы з 1934 года Алена Тэкарэне ў літоўскім гарадку Шакяй лячыла ўсіх маленькіх хлопчыкаў і дзяўчынак, не робячы ніякай розніцы з-за іх нацыянальнасці або дабрабыту бацькоў. А ў 1941 годзе на яе вачах фашысты расстрэльвалі тых, каго яна калісьці ратавала ад дыфтэрыту. Гэтыя крывавыя ўспаміны не пабляклі ад часу — яна адчула, што не мае больш сіл жыць у Шакяй, і паехала на работу сюды, у сельскую бальніцу.

У Ніжняй Панемуне прайшло ўжо чатырнаццаць год. Пройдзены ўсе дарожкі, пратаптаны новыя сцежкі: у хутары і ў сэрцы людзей. Людзі ведаюць:



Алена Тэкарэне.

калі б ты ні звярнуўся да Тэкарэне, яна прыедзе і дапаможа.

* * *

Адна з самых маладых, самых здольных і самая строгая з усіх брыгадзіраў на ўсіх заводах горада Паневежыс. Вось вам, як гаворыцца, грамадская думка пра брыгадзіра брыгады камуністычнай працы Валерыю Шыманене.

На фабрыцы расказваюць аб тым, як аднойчы дзве работніцы з брыгады Валерыі прапусцілі некалькі заняткаў у гуртку тэхмінімуму і ўпрошвалі начальніка аддзела кадраў, каб ён не паведаміў аб гэтым брыгадзіру. «Што ты з імі робіш, што яны цябе так баяцца?» — са смехам запытаў Валю кадравік. «Я? — шчыра здзівілася Шыманене. — Дык яны ж зусім не мяне баяцца, а ўсіх нас!»

...Рытм. Дакладны рытм працы, які нічым не парушаецца,— вось што самае важнае ў швейным цэху, дзе сорак шэсць работніц выконваюць пяцьдзесят тры розныя аперацыі. А такі рытм можа забяспечыць толькі дысцыпліна. Таму Шыманене і пастаралася перш за ўсё прывіць дзяўчатам сваёй брыгады пачуццё дысцыпліны, такой дысцыпліны, калі ні адна работніца не спазняецца ні на адну хвіліну, калі ўсё: праца, уменне, кожны рух — падпарадкаваны толькі адной мэце— выкананню плана.

Валерыі гэта ўдалося. Цяпер не яе баіцца работніца, якая правінілася. Яна ведае, што ёй «пападзе» ад усіх, калі яе ўчынак хоць крыху запляміў гонар брыгады.

Вельмі шкада, але не магу расказаць, што зрабіла адна маладая работніца ў вольны час, які застаўся ў яе, замест таго, каб дапамагчы іншым... Не магу. Убачыўшы ў маіх руках блакнот, Шыманене спалохалася: «Не пішыце гэтага! Яны ж не будуць мне давяраць, калі даведаюцца, што я расказваю тайны брыгады! А гэта работніца даўно ўжо нічога падобнага не робіць...»

Калі нядаўна адміністрацыя фабрыкі вырашыла перавесці Шыманене на іншую работу, жанчыны не захацелі нават слухаць пра гэта. Без Валі, без



Валерыя Шыманене.

яе камсамольскага запалу яны не заслужылі б звання брыгады камуністычнай працы. Не было б у цэху таго спакойнага настрою, які дапамагае забыць дробныя клопаты і цалкам адчуць радасць працы, а калі клопаты вялікія — знайсці сяброўскую дапамогу. І, нарэшце, не было б у цэху кветак, на якія так прыемна зірнуць, узняўшы вочы ў час работы. Вырошчваць кветкі — гэта таксама задумала Валя.

* * *

Казе Наркявічэне з цялятамі абыходзіцца, як з дзецьмі. Гаворыць пра іх, як пра дзяцей: што яны больш любяць, ад чаго папраўляюцца. Яе думка аб кіраўніках калгаса мяняецца ў залежнасці ад таго, колькі ўвагі ўдзяляюць яны ферме. У апошнія гады гэтая думка ўсё паляпшаецца. Цікавасць Наркявічэне да іншых раёнаў рэспублікі таксама залежыць ад таго, як там гадуюць цялят. У мінулым годзе яна была ў Латвіі, у калгасе імя Сталіна Бауcкага раёна — так, там умеюць абыходзіцца з жывёлай. Пасля вяртання адтуль яна не супакоілася да таго часу, пакуль яе цяляты не атрымалі такіх жа выгод, як у латышоў.

Так, як яна, жывёлу часам любяць людзі, якія не маюць уласных дзяцей. Але ў Наркявічэне старэйшы сын працуе ўжо старшынёй калгаса ў Зарасайскім раёне, а самыя малодшыя яшчэ бегаюць у школу. Добрыя дзеці. Усе яны з малых год прывыклі паважаць працу маці і захацелі, «калі будуць вялікія», стаць такімі ж, як яна: працавітымі і ўпартымі ў працы.

Наркявічэне гадуе цялят у калгасе імя Сталіна ўжо восем год. А на ферму яна



Казе Наркявічэне.

пайшла выпадкова, з-за свайго малодшага, які тады яшчэ па зямлі поўзаў. У паляводчую брыгаду было далёка хадзіць, а на ферму — тут жа. Чаму ж яна пазней так палюбіла сваю работу, што не шкадавала ні здароўя, ні сіл, — гэтага Наркявічэне не можа растлумачыць. Ніколі яна пра гэта не думала. Навошта разважаць аб тым, што ясна, як узыходзячае сонца: што для калгаса трэба старацца, як для сябе.

Калі размова зайшла пра ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, у яе вачах бліснулі слёзы. Ці то ад радасці, ці ад гордасці, ці ад хвалявання? Яна сама не ведае. Толькі адчувае, што працаваць ёй хочацца яшчэ лепш.

* * *

— Вы, карэспандэнты, любіце тое-сёе прыхарашыць, — сказала мне настаўніца Елеанора Расюлітэ, — навошта гэта патрэбна?

— Не, — адказала я, — мы толькі часам крышку дадаем фарбаў, каб чытачу было цікавей. Але цяпер, наадварот: баюся, што не здолею перадаць, якое паўнакроўнае, яркае жыццё ў кожнай з гэтых узнагароджаных жанчын.

— Наўрад ці трэба іх так выстаўляць... — усумнілася настаўніца. — Па-мойму ж, урадавым Указам узнагароджваецца не толькі той, хто атрымлівае ордэн, але праз яго — шмат людзей, агульная праца ўсяго калектыву. Хіба я маю права прыняць ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга толькі для сябе? Вы ведаеце, што такое выхаваўчая работа? Дзевяцікласнікі і дзесяцікласнікі добра вывучаюць хімію, ахвотна ўдзельнічаюць у гуртку, які я вяду. Але хіба яны былі б такімі цудоўнымі, калі б не было ў іх раней іншых, мне нават не вядомых настаўнікаў, якія выхоўвалі іх у першых класах? Светлавалосую Рыту, якая мне заўсёды адказвае на «пяцёрку», гадамі фарміравалі дзесяткі педагогаў, дзесяткі розумаў і сэрцаў, і кожны пакінуў у ёй нейкую дарагую крупінку... У выніку — вырасла мая Рыта. А я з'яўляюся толькі адной з многіх, якія рыхтуюць яе да жыцця.

Гэта праўда. Але, слухаючы словы Расюлітэ, я думала аб іншым: радасна было за яе вучняў. Калі яна сама так глыбока адчувае адну з самых цудоўных рысаў нашага грамадства — сілу калектыву, яна непрыкметна прыўе гэтае пачуццё сваім дзевяцікласнікам і дзесяцікласнікам. Словы ж любімага настаўніка гэтак жа, як яго вобраз, заўсёды жывыя ў нашых сэрцах. А Елеанора Расюлітэ — любімая настаўніца. Калі ў гэтым усумніцеся, вашы сумненні зараз жа рассее не толькі светлавалосая Рыта, але і любы вучань Біржайскай школы-інтэрната.

* * *

Калі ўсумніцеся — што ж, прыязджайце да нас самі. Убачыце гэтых жанчын і пераканаецеся, што ў іх жыцці няма непатрэбных размоў аб сэнсе жыцця і няма шэрых дзён.

**Бірутэ МАЦКАНІТЭ**



Елеанора Расюлітэ з вучнямі.



# Хіба можна гэта не любіць?

*ДАРАГАЯ РЭДАКЦЫЯ!*

*У часопісе «Работніца і сялянка» апублікаваны дзве беларускія народныя песні. Гэтыя песні былі надрукаваны па просьбе чытачоў. Нас цікавіць, каму могуць спадабацца такія песні? Каму яны прыносяць задавальненне?*

*Вядома, у розных людзей розныя густы. Але нам здаецца, што такімі песнямі добры густ у чалавека выхаваць нельга. Мы вельмі любім музыку. Нам падабаюцца творы рускіх і заходніх класікаў. У той жа час мы не адмаўляем і нашу сучасную эстрадную музыку. Напрыклад, такія творы эстраднай музыкі, як «Сілуэт», «Ніколі», «Гваздзічкі» і г. д., даюць слухачам значна больш задавальнення, чым дзесятак песень, падобных на «Чабарок». У народнай музыцы ёсць прыгожыя, задушэўныя песні. Але ёсць і такія, якія былі створаны народам у часы яго адсталасці і бескультурнасці. Дык навошта ж гэтыя песні папулярызаваць у нашы дні? Ці не лепш іх пакінуць для гістарычных лекцый? Нам вельмі хочацца, каб гэтае пісьмо было апублікавана ў часопісе. Магчыма, мы памыляемся. Тады Вы ўкажыце нам на нашы памылкі. За гэта мы будзем толькі ўдзячны.*

*Эла і Лілія ЖУКОЎСКІЯ.*

У ГЭТЫМ пісьме чытачак Элы і Ліліі Жукоўскіх выказана абурэнне з поваду апублікаваных у адным з нумароў нашага часопіса беларускіх народных песень «Чабарок» і «Дождж ідзе».

Як не правы аўтары гэтага пісьма, як глыбока яны памыляюцца, лічачы, што большасць народных песень нібы ўжо даўно ўстарэла і цяпер малапрыгодная для шырокай папулярызацыі. Не, песня народная не ведае старасці. Яна дарагая нам тым, што лепш за ўсякага летапісца адлюстравала амаль усе гістарычныя падзеі, пачынаючы з моманту ўзнікнення Кіеўскай дзяржавы і канчаючы нашымі днямі, адлюстравала жыццё і быт людзей, іх барацьбу супраць іншаземных захопнікаў і сацыяльнага зла, за шчаслівую будучыню. Іменна дзякуючы народнай песні мы даведваемся пра тое, як працавалі нашы продкі ў старажытнасці і чым займаліся яны ў час адпачынку.

Многія творы музычнага фальклору настолькі ярка і вобразна складзены, што не страцілі мастацкай вартасці і сілы ўздзеяння на слухачоў да сённяшняга дня. Хто з нас, напрыклад, не чуў і не спяваў у дзіцячыя і школьныя гады вядомую песню «А мы проса сеялі»? Народжаная ў далёкія часы, гэтая працоўная карагодная песня-вяснянка ў простай паэтычнай форме расказвае пра падсечнае земляробства, калі аратыя расчышчалі тэрыторыю ад карэнняў дрэў і на ўзаранай зямлі сеялі хлебныя злакі.

У музычным фальклоры трох блізкіх па мове і звычаях народаў — рускіх, украінцаў і беларусаў — самымі старажытнымі лічацца каляндарна-абрадавыя песні. Іх называюць «каляндарнымі» таму, што яны прысвячаліся чатыром порам года або асноўным відам земляробчага працоўнага працэсу. Да гэтага найбольш ранняга жанру прымыкаюць працоўныя і лірычныя песні, якія былі нязменнымі спадарожнікамі людзей у час іх работы ў полі, і песні абрадавыя, гуллівыя, велічальныя, якія выконваліся ў дні народных земляробчых свят.

Колькі сапраўднай паэзіі, прыгажосці і задушэўнасці тояць у сабе «купальскія» песні. Іх узнікненне таксама звязана са старадаўнім абрадам, і гучалі яны на свяце летняга сонцастаяння. Хто не чуў, напрыклад, цудоўную па мелодыі песню «Ой, рана на Йвана», якой у Беларусі пачыналіся масавыя гульні ў ціхую купальскую ноч? Гэтая песня — жамчужына народнай творчасці — жыве і цяпер. яна трывала ўваходзіць у рэпертуар самадзейных і прафесіянальных хораў.

Нам дарагія і працоўныя земляробчыя песні асенняга цыкла, якія выконваліся ў мінулым жнеямі ў час уборкі

ўраджаю і пасля заканчэння палявых работ. Як часта ў жніўных песнях чуецца горкі папрок на цяжкую жаночую долю, гучаць матывы сацыяльнай несправядлівасці. Так, у беларускай жніўнай песні «Наш пан баран» народ закляйміў ганьбаю сваіх эксплуататараў-прыгоннікаў. Вось што ў ёй спяваецца:

Здароў, пане, жыта зжаўшы,
Каб ты здох, не лепятаўшы,
Не хварэўшы, не балеўшы,
Нашай працы плёны еўшы.

У наш час масавыя святы ўраджаю, калгасныя «дажынкі» набылі зусім іншы сэнс і новы змест. Не стала больш месца для сумных мелодый, ім на змену прыйшлі вясёлыя, жыццярадасныя песні, якія ўслаўляюць свабоду і працу на сацыялістычных палях.

З каляндарна-земляробчым песенным цыклам у многім пераклікаюцца сямейна-абрадавыя песні (велічальныя, радзільныя, калыханкі, дзіцячыя і, нарэшце, вясельныя). Яшчэ і цяпер сям-там на вясковых вяселлях, якія калісьці нагадвалі шматдзённыя народныя прадстаўленні з музычна-драматычнымі сцэнкамі, чуюцца пранікнёныя песні аб провадах нявесты ў дом свайго будучага мужа і яе развітанні з роднай маці перад адыходам у другую сям'ю або песні жартоўныя ў адрас няўдалых сватоў («Прыйшоў на вяселле наш сваток»).

Мы цэнім народныя песні за тое, што ў іх з непадробным пачуццём і вялікай шчырасцю раскрываюцца думы і спадзяванні працоўных мас, некалі абяздоленых і бяспраўных, але сумленных і высакародных у сваіх парывах і імкненнях. Гэтымі якасцямі валодаюць, дарэчы, працяжныя лірычныя песні, для якіх уласцівыя шырыня, маляўнічасць і імправізацыйнасць мелодыі, разнастайнасць тэматыкі. На самай справе, пра што ў іх толькі не спяваецца: пра гарачую любоў да сваёй Радзімы і душэўныя пакуты чалавека, закінутага далёка на чужыну, дзе яго чакае адзінокая старасць; пра бунтарскую маладую сілу, якая прагне расправіцца з ненавіснымі прыгнятальнікамі і назаўсёды пакончыць з рабскай працай на багацеяў; пра разлуку дзяўчыны з каханым.

Вось сустрэліся тайком хлопец і дзяўчына пад разгалінастай вярбою, але яны не ведаюць, што іх чакае наперадзе, не ўпэўнены, што бацькі згодзяцца на іх вяселле («А ў полі вярба»). І часта ў закаханых рушыліся мары аб сямейным шчасці, таму што дзяўчыну сілком аддавалі замуж за нялюбага чалавека («Ты чырвоная каліна»). Але ёсць у беларускім фальклоры і такія творы, як «Што за месяц, што за ясны». Тут светлае і нястрымнае каханне, нарэшце, перамагае, назаўсёды парываючы з патрыярхальнымі сямейнымі асновамі. Любоўныя песні — гэта яркія карціны душэўных перажыванняў і барацьбы чалавечых страсцей.

Што ж дрэннага знайшлі Э. і Л. Жукоўскія ў беларускіх песнях «Чабарок» і «Дождж ідзе»? Па зместу абедзве яны жартоўныя. Толькі першая з іх нарадзілася яшчэ ў дарэвалюцыйныя гады, а другая складзена ў нашы дні ўдзельнікамі вядомага на Гомельшчыне Азершчынскага калгаснага хору. У аснову песні «Чабарок» пакладзены вясёлы жарт дзяўчыны з непрыгожага «кавалера». Яе мара — мець такога жаніха:

Каб і люлькі не курыў,
Табакі не нюхаў,
Чужых жонак не любіў,
Адну мяне слухаў!

З гэтых радкоў відаць, што твор прасякнуты высокай мараллю і вельмі сугучны нашаму часу. Тое ж самае варта сказаць і пра сучасную песню «Дождж ідзе». Прысвечаная жыццю калгаснай моладзі, гэтая песня з лёгкім гумарам малюе сяброўскія ўзаемаадносіны паміж хлопцам і дзяўчынаю.

У чым жа тады недахоп гэтых твораў? Няўжо ў тым, што яны адрозніваюцца ад іншых сакавітым народным гумарам і дзявочай пяшчотнай гарэзлівасцю? Але ж жанр жартоўнай і сатырычнай песні пакуль яшчэ не зжыў сябе і мае, бадай, найбольшы поспех у слухачоў. Прыгадайце хоць бы, якімі дружнымі воплескамі ўзнагароджвае публіка артыстаў ансамбля песні і танца пад кіраўніцтвам Г. Цітовіча, калі яны выконваюць у канцэртах папулярныя жартоўныя песні «Хацела ж мяне маці замуж аддаці», «Як пагнала бабуленька куранятак пасці» і інш. Таму, нам здаецца, не было ніякіх падстаў абвяшчаць «Чабарок» і тым больш сучасную песню «Дождж ідзе» аджыўшымі свой век і нікому не патрэбнымі: яны гэтага не заслугоўваюць.

Якое багацце тэм, вобразаў і настрояў, якое мноства жанраў сустракаецца ў музычным фальклоры! Лепшыя яго ўзоры — невычэрпная крыніца натхнення для прафесіянальных кампазітараў. Гістарычныя песні і думы пра важакоў народных паўстанняў, рэвалюцыйныя гімны — «Смело, товарищи, в ногу», «Славься, свободы вольное слово», жалобны марш «Вы жертвою пали», песні палітзняволеных і ссыльных «Слушай!», «Беснуйтесь, тираны!» — усё гэта ўвайшло ў плоць і кроў нашага пакалення, як самае дарагое і блізкае. Дык як жа пасля гэтага можна думаць, што народная песня нібы аджывае свой век, што яе трэба «пакінуць для гістарычных лекцый»!

Нікому не забараняецца мець свае ўласныя эстэтычныя сімпатыі і прыхільнасці, свае, няхай нават і суб'ектыўныя, погляды на тыя ці іншыя творы мастацтва. Але трэба навучыцца адрозніваць сапраўды прыгожае ад усяго наноснага, фальшывага і паказнога.

**Георгій ЗАГАРОДНІ**



**У вёсцы Морач Клецкага раёна Мінскай вобласці любяць народную песню і беражліва захоўваюць традыцыі яе выканання. Слава аб галасістых марачанскіх дзяўчатах выйшла далёка за межы вобласці.**

На здымку: **хор калгаса «Зара» Клецкага раёна.**

Фота У. Крука.

# КАШТОЎНЫ ПАДАРУНАК

За мінулы год літаратурны музей Якуба Коласа наведала звыш трохсот турыстаў з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

Аднаго разу пасля экскурсіі завязалася цікавая размова паміж супрацоўнікамі музея і замежнымі турыстамі. Сябры з ГДР даведаліся, што ў музеі няма твораў Якуба Коласа ў перакладзе на нямецкую мову. І вось нядаўна ў музей прыйшоў пакет з Берліна. Гэта была аповесць Якуба Коласа «Партызаны над Прыпяццю («Дрыгва») на нямецкай мове. У пакет было ўкладзена пісьмо такога зместу:

«Дырэктару музея Якуба Коласа.

Паважаны таварыш, піша вам жанчына, якая жыве ў горадзе Берліне па вуліцы Клемента Готвальда. Я была рада наведаць ваш музей у канцы красавіка 1960 года. З глыбокім задавальненнем я адзначыла, як людзі Савецкага Саюза ўшаноўваюць тых, хто прысвячае жыццё сваёй Радзіме. Я запыталася тады ў вас, ці маеце вы творы Якуба Коласа на нямецкай мове. Вы адказалі, што не.

Калі я звярнулася ў выдавецтва культуры і прагрэсу ў Берліне, то адразу пачула, на сваю радасць, што якраз цяпер выйшла аповесць Я. Коласа ў нямецкім перакладзе.

Думаю, што зраблю прыемны сюрпрыз, калі прышлю вам гэтую аповесць.

Са шчырай павагай да вас ваша Шарлота Айхорн».

Творы народнага паэта Беларусі Якуба Коласа ў перакладзе на нямецкую мову раней не выдаваліся. «Партызаны над Прыпяццю» — першая кніга пісьменніка, якая выйшла ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. Яна выстаўлена ў вітрыне, дзе экспануюцца творы Якуба Коласа ў перакладзе на мовы народаў свету.

**М. ЖЫГОЦКІ**

# ЯНЫ ВАЯВАЛІ РАЗАМ

Майскай раніцай я выйшаў з гасцініцы і накіраваўся на цэнтральную плошчу, куды ішлі сіроцінцы на адкрыццё помніка воінам і партызанам, загінуўшым у барацьбе з фашысцкімі захопнікамі. Многіх я ведаў тут. У гэтым раёне некаторы час дзейнічаў наш атрад. У брацкіх магілах, на якіх пастаўлен помнік, былі пахаваны і байцы нашага атрада.



Любоў Паўлаўна Каротчанка з унукамі Маргарытай і Сярожам.
Фота П. Нікіціна.

Доўга стаяў ля крайняй магілы, думаў аб тых, хто не вярнуўся з вялікай, жорсткай бітвы...

Надрыўны плач вывеў мяне з забыцця. Перада мной, апусціўшы ў смутку галовы, стаялі Саша і Сяргей Іванавіч Каротчанка. А Любоў Паўлаўна схілілася над магілай і горка плакала, ускладаючы на яе вянок з жывых кветак. І ўспомнілася мне, як гэтая простая беларуская жанчына ўключылася ў барацьбу. Такіх, як яна, былі тысячы.

...У той апошні суботні мірны дзень яна праводзіла мужа ў Маскву ў камандзіроўку. У шумным натоўпе праводзячых ледзь чутны былі галасы дзяцей. Яны прасілі бацьку прывезці ім падарункі. Старэйшаму, Пецю, ішоў семнаццаты, а меншаму, Сашу, — пятнаццаты. Не ведалі яны, што ля парога бяда, вялікае выпрабаванне, нягоды, пакуты. Наступная раніца прынесла страшэнную вестку: вайна! Пачаліся бамбёжкі. Любоў Паўлаўна з дзецьмі пайшла ў вёску да брата. Сыны цэлымі днямі прападалі ў лесе. Хлопцы адшукалі закінутыя бліндажы, а ў іх шмат зброі, патронаў. Усё гэта яны перацягвалі, перахоўвалі. Потым звязаліся з камуністамі, якія засталіся ў падполлі, і атрымалі першае заданне — перадаць ім прыхаваную зброю. А вясной Пётр пайшоў у атрад.

Маці таксама ўключылася ў барацьбу. Яе накіроўвалі ў гарнізоны даведвацца аб колькасці варожых салдат, ахове, паліцаях, даставаць медыкаменты, соль, тытунь. Аднойчы яна атрымала заданне пайсці ў Шуміліна і забраць медыкаменты ва ўмоўленым месцы. Калі вярталася, за хутарам Сабалеўка сустрэлася з паліцыяй. Яна хутка кінула медыкаменты ў кусты, але было позна, паліцаі заўважылі. Білі яе па-зверску: па твары, у жывот, грудзі. Білі, пакуль страціла прытомнасць. Калі апрытомнела, пагналі далей.

Хутка ля доміка лесніка паліцаі заўважылі вуллі з мёдам. Як шакалы на падлу, накінуліся яны на іх. Вартаваць жанчыну застаўся адзін. І тут яна падумала, што лепш памёрці ад кулі, чым на шыбеніцы. Яна непрыкметна скінула вялікія цяжкія боты (яны б заміналі ёй), ускочыла і пабегла да лесу. Пачуліся стрэлы, адзін, другі, трэці... Кулі, як пчолы, гудзелі навокал. Сілы пакідалі. Раптам у вачах пацямнела, упала. Прыўзняўшы галаву, убачыла, што да яе бягуць з лесу.

«Свае!» — закрычала яна...

К гэтаму часу карнікі разгарнулі аперацыі ў раёне чыгунак Полацк — Віцебск — Невель, наступаючы з усіх бакоў. Аднойчы ўначы на чыгунку Полацк — Віцебск пайшоў з групай падрыўнікоў і Пётр. Ён і партызан Баравікоў узабраліся на насып чыгуначнага палатна. З-за павароту на вялікай скорасці імчаўся поезд. Адступаць было позна. Выбух забраў іх жыцці разам з варожым саставам. Любоў Паўлаўна некалькі дзён не ведала пра гібель сына. А калі даведалася, цяжкая хвароба зваліла яе.

...Кальцо карнікаў звужалася. Партызаны адыходзілі ў другі раён. Накрытая вялікім кажухом ляжала Любоў Паўлаўна на санях. У рытмічным бегу саплі коні. Саша бег побач, баючыся адстаць. Ён бачыў, што маці дрэнна, але нічым дапамагчы ёй не мог. Раптам недалёка ад калоны разарваўся снарад, потым другі. Паліў фашысцкі бранепоезд, перагароджваючы дарогу партызанскай калоне. Коні рванугіся ўперад. Рыссю праскочылі чыгунку.

Кулямётны трэск, выбухі — усё адразу сціхла пасля аглушальнага выбуху. Гэта партызаны падарвалі бранепоезд. Любоў Паўлаўна схамянулася. Вось такі ж выбух забраў і яе Пецю. Слабым голасам яна паклікала Сашу. Адказу не было.

— Саша! Сашачка! — клікала яна ў роспачы, але дарэмна... Да раніцы партызанскія брыгады і атрады перайшлі ў Расонскі раён. Хворых і раненых размясцілі ў вёсцы Пірагі. У гэтай маленькай, кволай жанчыны з'явілася столькі сіл, што яна здолела перамагчы хваробу, гора. Ад брыгады да брыгады, ад атрада да атрада хадзіла яна, шукаючы сына. Аднойчы ўвечары Любоў Паўлаўна вярнулася ў брыгаду Кароткіна. Нылі стомленыя ногі. Яна зайшла ў дом і лягла, як была, у адзенні. Скрыпнулі ўваходныя дзверы. Увайшоў веставы і паведаміў ёй, што ў адным з атрадаў ёсць баец, падобны на Сашу.

Любоў Паўлаўна хутка сабралася і пайшла. Пайшла, верачы і не верачы, што знойдзе малодшага сына. Пад нагамі слізгала звілістая санная дарога: у лесе снег таяў павольна.

Асцярожна абышла завал і спусцілася да ракі. Нішча, якая ўжо разлілася, разззлавана бурліла. Вада зносіла бярвенні, хлявы, стагі застаялага сена. Некалькі мінут яна са страхам аглядала бераг. Невялікі плыт стаяў, прыколаты доўгім шастом. Узялася за шост. Ступіла на слізкія бярвенні і адпіхнула плыт. Цячэнне падхапіла, закружыла, панесла. Вялікая ільдзіна імчалася на плыт. Яе ўдар разваліў яго. Здавалася, стальным абручом абхапіла цела пякучая ледзяная вада. Інстынктыўна ўхапілася за бервяно. Бервяно крутнулася і выслізнула з рук.

— Саша! — крыкнула яна. Ногі ўпёрліся ў нешта цвёрдае.

Змучаная, яна ўзабралася на бераг і павалілася. Аддыхаўшыся, прысела, зняла боты і выліла ваду. Крыху выціснула спадніцу, пераабулася і пайшла праз лясок да вёскі, да хлява, што стаяў недалёка ад узлесся. Некалькі крокаў засталося да яго, як вокрык вартавога спыніў яе. Здавалася, гэты голас яна пазнала б сярод соцень іншых галасоў. Але адказаць не магла: язык задзервянеў, не падпарадкоўваўся. Вартавы крыху пачакаў і выйшаў з-за хлява.

— Са-ша-а! Сынок! — прастагнала Любоў Паўлаўна і страціла прытомнасць.

У штабе атрада стаяла худзенькая, маленькая жанчына. Чорныя валасы зачэсаны з нахілам на правы бок і зацягнуты ў тугі вузел. Крыху кірпаты нос, добрыя прамяністыя маршчынкі ля прыжмураных вачэй.

— Што ж будзем рабіць, Любоў Паўлаўна? — спытаў я.

— Будзем вызваляць зямлю родную ад катаў праклятых!..

У абдымку з Сашам выйшла яна са штаба атрада насустрач асляпляльна яркаму сонцу...

... З плошчы мы вярталіся разам.

Любоў Паўлаўна расказала мне, што, як і ў атрадзе, яна пасля вайны ўвесь час працавала поварам. А цяпер — на пенсіі.

Мінула столькі год пасля Айчыннай вайны, але нішто не забылася. Не, вайны больш не павінна быць! Не павінны маці праліваць слёзы аб загінуўшых сынах.

**Н. Г. БРАТУШЭНКА,**
былы камандзір партызанскага атрада.

*Прачытайце гэтую кнігу!*

# Палымянае жыццё



В. З. Харужая са сваім мужам С. Г. Карнілавым (1940 г.).

«Мою любовь, широкую,
как море,
Вместить не могут жизни
берега».

— Любоў да свае прамяністай Беларусі, да свайго шчырага працавітага народа, да родных палёў і пералескаў, да ціхага пераззвону лясных ручаін, да дзіцячага бесклапотнага смеху...

Каб шукаў, каб хацеў знайсці і словамі глыбей акрэсліць жыццё чалавека, больш вычарпальных, чым гэтыя словы, не знойдзеш. Імі пачынаецца адзін з «Лістоў на волю» Веры Харужай. Яны, гэтыя словы-вершы, могуць служыць эпіграфам і да ўсяго жыцця яе самой — слаўнай беларускай дачкі.

«Калі б я хацела вызначыць маё жыццё, я б сказала, што ўсё маё жыццё — гэта яркі сонечны веснавы дзень, і я б не схлусіла — гэта сапраўды так!»

«Жыццё цудоўнае, і з турэмнага акенца здаецца яшчэ больш цудоўным».

«У мяне час ляціць і ляціць. Ужо трэцяя вясна ў турме, а восень ужо будзе чацвёртая... Як я люблю раннюю вясну! Але не менш за вясну люблю і лета, і восень, і зіму, люблю безупынны ўрачысты карагод розных, па-свойму цікавых, месяцаў, дзён... Якое шчасце, што ў турме я ўсё-такі бачу, адчуваю змену пораў года».

«Перадай усім ад мяне, што я не толькі жыву, але і гару жыццём, работай, захапленнем, энергіяй. Скажы, што мы жыццё бяром за шчэлепы, не даем сябе з'есці з кашай, што пакуль што гэта бліскуча ўдаецца, што мы — пераможцы — пастараемся перамагаць да канца!»

Так і кніга, што выйшла нядаўна з друку, называецца «Слаўная дачка беларускага народа». Гэту кнігу, напісаную крывёй высакароднага сэрца самой Веры Харужай ( у кнігу таксама ўвайшлі ўспаміны людзей, якія блізка ведалі Веру), неабходна адразу ж выставіць на бібліятэчныя паліцы. Яе павінны чытаць усе. На прыкладзе гэтага мужнага жыцця павінны выхоўвацца нашы дзеці, наша моладзь. А людзі старэйшага пакалення — аднагодкі Веры Харужай — будуць успамінаць сваё юнацтва, свае камсамольскія гады, сваю барацьбу за наша светлае, бясхмарнае сёння...

З марай і верай у сэрцы ў гэтае светлае, бясхмарнае сёння і пражыла ўсё сваё нядоўгае, але, як зорка ў небе, яркае жыццё Вера Харужая.

«Хіба гэта не вышэйшае шчасце, якое можа быць: жыць і змагацца, змагацца з бязмежнай верай у перамогу, аддаваць любімай рабоце і барацьбе ўсе сілы, усю душу, усе нервы, быць маладой, мець шмат дарагіх і любімых сяброў!»

«Камсамол, камсамол! Не пяць, а пяцьдзесят гадоў турмы бяссільны прымусіць мяне забыць аб тым, што камсамол зрабіў мяне бальшавічкай, выхаваў, загартаваў, навучыў не толькі змагацца, але і любіць рэвалюцыйную барацьбу больш за ўсё, больш за жыццё».

Кніга «Слаўная дачка беларускага народа» знаёміць чытача з дакументамі — пісьмамі і артыкуламі Веры Харужай. Пісьмы гэтыя пісаліся з белапольскіх турмаў (1925 — 1932 гг.) — спачатку Беластоцкай, а потым цэнтральнай катаржнай жаночай турмы «Фардон», дзе Вера — сакратар ЦК камсамола Заходняй Беларусі — пакутавала сем год.

Другі цыкл пісьмаў — таксама «на волю» — адносіцца да перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Напісаны яны былі Верай з віцебскага падполля (кастрычнік — лістапад 1942 г.).

У пачатку вайны Вера змагалася супраць ворага ў партызанскім злучэнні пад камандаваннем праслаўленага героя грамадзянскай і Айчыннай войн В. З. Коржа. Тут, у гэтым атрадзе, у барацьбе з нямецкімі захопнікамі загінуў яе муж і шчыры друг С. Г. Карнілаў. Адсюль па заданню камандавання атрада Вера Харужая, будучы на апошніх месяцах цяжарнасці, перабралася цераз лінію фронта і звязалася з камандаваннем Савецкай Арміі. Выканаўшы заданне, яна знайшла сваіх родных — маці, пяцігадовую сваю дачушку Анютку і сясцёр. Некаторы час яна жыла з імі ў глыбокім тыле.

...А за тысячы кіламетраў ад яе гарэла ў агні родная беларуская зямля, у крыві тапіліся родныя сёлы і гарады, жудасным прывідам прасціраліся ў спакутаванае неба чорныя шыбеніцы.

У 1942 годзе, пакінуўшы дзяцей (сыну было толькі чатыры месяцы) і родных, Вера Харужая на чале групы дзяўчат пад прозвішчам Карнілавай Ганны Сяргееўны была накіравана ў нямецкі тыл, у Віцебск, для арганізацыі партыйнага падполля. Пяць тыдняў атрымлівала камандаванне Савецкай Арміі каштоўныя звесткі аб нямецка-фашысцкіх захопніках ад Веры. На працягу пяці тыдняў Вера здолела наладзіць моцную партыйную сувязь у тыле ворага. Аднак гестапа ўсё ж напала на след Веры. Яе і яшчэ некалькі чалавек з падпольнай групы фашысты схапілі на явачнай кватэры.

«Я вас ненавіджу! Я савецкая патрыётка і рабіла ўсё, каб вас знішчыць. Больш я не скажу вам ні слова!»

Гэта былі апошнія словы Веры Харужай.

Марознай лістападаўскай раніцай гітлераўцы адвезлі Веру ў Ілаўскі роў і там яе разам з сяброўкамі расстралялі... А калі фашысцкія каты пакінулі месца свайго злачынства, зямля яшчэ варушылася: людзей закопвалі напаўжывымі... У час наступлення Савецкай Арміі, каб схаваць сляды свайго жудаснага злачынства, фашысты адкапалі трупы і спалілі...

Так загінула Вера Харужая — мужная дачка беларускага народа, прыгожы, цудоўны чалавек душы светлай і чыстай, як вясенняе неба, якое яна так любіла.

І ўдзячная Радзіма акружыла імя і памяць сваёй дачкі бессмяротнай славай Героя Савецкага Саюза.

Е. СІЛІНА

# Сябры дзяцей

ДЗІЎНЫЯ рэчы творацца ў адной з мінскіх кватэр! Дывановая дарожка ператвараецца раптам у снежную дарогу, тэлевізар робіцца сялянскай печчу, а ярка-чырвоная вязаная кофта «бабулі Клавы», пакладзеная на падлогу, — гарачым вогнішчам.

У кватэры чуюцца галасы... капрызнай каралевы, злой мачыхі і ўсіх месяцаў, якія толькі бываюць у годзе.

Пабочны чалавек, магчыма, і здзівіцца, а суседзі ўжо ведаюць: у Надзеждзіных у кватэры рэпетыцыя. Там — дзеці з усяго дома, а сама гаспадыня Клаўдзія Сцяпанаўна, «бабуля Клава», як называюць яе дзеці, дае апошнія рэжысёрскія ўказанні. Часовая «дэкарацыя» — дывановая дарожка, тэлевізар або бабулiна кофта — не бянтэжыць маленькіх артыстаў. На сцэне будзе сапраўдная дэкарацыя.

На сцэне! Не ўсім дзецям, якія жывуць па Ульянаўскай вуліцы, па вуліцы імя Энгельса і Янкі Купалы, верыцца яшчэ, што цяпер ёсць у іх свая сцэна. Але сцэна ёсць: яна ў піянерскім клубе, які падаравала дзецям домакіраўніцтва. Ёсць у клубе і настольны тэніс, і більярд, і розныя гульні. Ёсць там і кінаапарат «Украіна». Кіно, вядома, справа добрая. А спектакль, ды яшчэ «Дванаццаць месяцаў», — яшчэ цікавей.

Я назіраю за рэпетыцыяй у кватэры Клаўдзіі Сцяпанаўны, і мне прыпамінаюцца многія сустрэчы з людзьмі вось такой жа невычарпальнай энергіі, як і «бабуля Клава». Гэта яна была адным з ініцыятараў стварэння пры домакіраўніцтве савета сяброў піянераў.

«Савет сяброў піянераў» заклікан дапамагаць піянерам, акцябратам — усім дзецям двара весела жыць, здзяйсняць добрыя справы, набываць патрэбныя навыкі, уменне. Гаворачы папраўдзе, не ўсе яшчэ «піянерскія сябры» ўзяліся за высакародную справу з агеньчыкам, выдумкай, з душой, як гаворыцца. Што ж, справа новая, калі хочаце, мала вывучаная і не кожнаму даецца. Але ва ўсіх членаў савета перад вачыма цудоўны прыклад Клаўдзіі Сцяпанаўны і, трэба думаць, што работа ў новым піянерскім клубе, які знаходзіцца ў доме № 11 па вуліцы Янкі Купалы, хутка-хутка разгорнецца шырока.

У гэта асабліва верыш, калі ўспамінаеш яшчэ аднаго цудоўнага сябра дзетвары — Галіну Цімафееўну Галоўка з горада Баранавічы.

Галіна Цімафееўна, якая прайшла ўсю Айчынную вайну з сумкай медыцынскай сястры, зараз хатняя гаспадыня. Але як не стасуецца гэтая назва — хатняя гаспадыня — да тых спраў, якімі яна зараз кіруе! Перш за ўсё, Галіна Цімафееўна здолела ўжо разварушыць усіх жыхароў дома № 34, што стаіць на Савецкай вуліцы. І калі пры домакіраўніцтве, дзе «ўвіхаецца» Клаўдзія Сцяпанаўна, створан зараз піянерскі пост, то пры домакіраўніцтве дома № 34 горада Баранавічы вось ужо некалькі год працуе, жыве зводны піянерскі атрад з рамантычнай назвай — «Дубовы лісток».

Розніца паміж піянерскім пастом і зводным атрадам даволі істотная. Калі дзеці, якія ўваходзяць у піянерскі пост, з'яўляюцца адначасова членамі піянерскага атрада свайго класа, школы, то зводны атрад пры домакіраўніцтве — самастойны дзіцячы калектыў, які выконвае ўсю піянерскую работу. Кіраваць зводным атрадам, зразумела, намнога складаней. І тым не менш у любую пару года кожны дзень на мачце, што стаіць на двары, узлятае чырвоны сцяжок: там не затухае піянерскае жыццё. А важакі ў піянераў — вельмі паважаныя дзецьмі людзі: таты і мамы, дзядулі і бабулі. Адны з іх працуюць, другія пайшлі на пенсію, але няма сярод сяброў піянераў людзей абыякавых. І што яшчэ характэрна: Г. Галоўка, Г. Маршына, В. Колесава, ды і ўсе астатнія сябры дзетвары з хваляваннем расказваюць аб тым, наколькі багацейшым, цікавейшым стала іх жыццё, калі яны заняліся грамадскай работай у піянерскай арганізацыі, якое маральнае задавальненне дае ім усведамленне, што і яны прыносяць карысць і радасць людзям.

Чаму ж эмблемай зводнага атрада стаў вышыты на рукавах і на пілотках дубовы лісток? Што б ні рабілі піянеры, галоўнымі ў іх застаюцца клопаты аб «зялёным сябры». Свой двор дзеці ператварылі ў цудоўны зялёны куток прыроды. Піянерскія дрэвы растуць і на прылягаючых да дома вуліцах, скверах. І няма ў маладых дрэўцаў ахоўнікаў больш мужных, сяброў больш верных, чым дзеці са зводнага атрада «Дубовы лісток».

Аб добрых справах піянераў, якімі кіруюць жыхары дома № 34, можна расказваць і расказваць.

...Я назіраю, як рэпеціруе з дзецьмі-артыстамі Клаўдзія Сцяпанаўна, і мне прыходзяць на памяць сустрэчы з вялікім, шчырым сябрам сельскіх піянераў — з Яфрэмам Мацвеевічам Шкрабай.

Сорак пяць гадоў прапрацаваў Яфрэм Мацвеевіч сярод дзяцей, піянераў. Цяпер настаўнік пайшоў



Клаўдзія Сцяпанаўна Надзеждзіна сярод юных артыстаў.
Фота П. Нікіціна.

на пенсію. Усе лічаць: папрацаваў стары слаўна, пара яму і на адпачынак. А гэты самы стары падымаецца на золку і ідзе ў саўгасныя майстэрні або на ферму. А то — адпраўляецца за тры кіламетры ад сваёй вёскі — у Малінаўку, Бараўцы. І ўсюды ў старога настаўніка адны клопаты: чым бы захапіць і заняць саўгасных піянераў, да якой справы іх прыставіць?

Яфрэм Мацвеевіч — чалавек са шчодрай і добрай душою, з агеньчыкам і выдумкай — здолеў расшавяліць многіх аднасяльчан: сабраў пры піянерскай дружыне сваёй Дубаўлянскай школы (яна ў Мінскім раёне) вялікі савет сяброў юных піянераў. Стаўшы старшынёй гэтага савета, Яфрэм Мацвеевіч прапанаваў: «Няхай кожны з вас, таварышы, нясе адказнасць за якую-небудзь адну канкрэтную справу». Сам ён стварыў у дружыне зводны піянерскі хор, стаў яго дырыжорам. Ад работнікаў саўгаснага клуба спатрэбілася «самая дробязь», — каб дзверы клуба ў любы час былі адчынены перад дзетварой. За хуткую дастаўку піянераў з бліжэйшых вёсак у Дубаўляны пачаў адказваць сам дырэктар саўгаса «Бальшавік» Фама Анісімавіч Касько. На яго сумленні, як члена савета сяброў піянераў, — і забеспячэнне дзяцей транспартам для паездак у Мінск — у Палац піянераў або Тэатр юнага гледача. Разварушыў Яфрэм Мацвеевіч нават повара дзіцячага сада Ольгу Паўлаўну Рабікіну. Яна пачала вучыць дзяўчынак дамаводству. А майстар сталярнай справы Міхаіл Фёдаравіч Дубовік з ахвотай узяўся перадаць хлопчыкам сваё рамяство. Пакуль гурток юных сталяроў працаваў пры саўгаснай майстэрні, нястомны Яфрэм Мацвеевіч выклапатаў грошы для будаўніцтва школьнай майстэрні. І сам стаў на чале будаўніцтва.

Словам, былы настаўнік узняў на высакародную справу — на работу з піянерамі — калгасных брыгадзіраў, афіцэра ў адстаўцы, хатніх гаспадынь, саўгасных майстроў — сталяроў, цесляроў...

Успамінаючы сустрэчы з такімі людзьмі, міжволі думаеш: «А колькі знойдзецца ў іншым доме або пасёлку людзей, свабодных ад усякай справы! Іншыя нават з даволі салідная адукацыяй, з арганізатарскімі талентамі, з цікавымі прафесіямі. Вось калі б гэтую адукацыю, гэтую энергію, гэтае ўменне — на карысць агульнай справы, на дапамогу сям'і і школе!»

В. МАРОЗАЎ

***МАМА, ПАЧЫТАЙ!***



Мал. Р. Віткоўскага

# Спрытныя рукі

Ядзвіга БЯГАНСКАЯ

Сядзіць Людачка ў сваім куточку сярод цацак і думае, што б ёй такое маме на свята падарыць!

— Трэба што-небудзь цікавае прыдумаць. Але гэта так цяжка. І параіцца Людачцы няма з кім. Дома нікога няма. Толькі Лялька ды Мішка плюшавы сядзяць каля Людачкі і маўчаць. пазіраючы на яе сваімі круглымі шклянымі вачыма.

Маме трэба зрабіць падарунак, а гэта не такая лёгкая справа, калі табе ўсяго шэсць гадоў.

«І сапраўды, што ж я ўмею рабіць!»— падумала Людачка.

І аказалася, што яна ўмее рабіць нямала добрых рэчаў. Калі Людачка гасціла ўлетку ў бабулькі, тая навучыла яе рабіць кветкі з паперы і шарсцяных нітак. А яе суседка Танечка паказала ёй, які прыгожы кошычак можна сплесці з каляровай паперы. Людачка ўмее маляваць каляровымі алоўкамі і ляпіць розныя рэчы з пластыліну.

Людачка ўзялася за справу. Перш за ўсё яна назбірала каляровай паперы, нарэзала з яе роўненькіх стужачак і пачала плесці кошычак. Прыгожы кошычак атрымаўся, зграбны.

— А цяпер я зраблю кветкі і пакладу ў гэты кошычак, — падумала Людачка і пачала шукаць нітак каляровых шарсцяных.

Дастала Людачка скрыначку, у якой мама хавала каляровыя ніткі для вышывання, і ўзялася за кветкі. Нямала пасядзела Людачка, пакуль зрабіла кветкі, але і букет у яе атрымаўся цудоўны. Паклала яго Людачка ў свой кошычак папяровы і ад радасці ў ладкі запляскала. Ляжаць кветкі ў кошычку, як жывыя, вясёлыя, яркія.

А вось і алоўкі каляровыя. Іх у Людачкі аж дванаццаць штук. Блакітным можна намаляваць неба. жоўтым — сонца, чырвоным — макі, ды ці мала можна намаляваць, калі ў цябе столькі каляровых алоўкаў! Варта толькі ўзяць аркуш белай паперы і крыху падумаць.

Мама любіць, калі на дварэ свеціць сонца і цвітуць кветкі, і Людачка намалявала на белым аркушы паперы блакітнае неба, а на ім вялікае жоўтае сонца з доўгімі праменнямі. Пад сонцам яна намалявала зялёную траўку, а на ёй — вялікія чырвоныя макі. Потым Людачка ўспомніла, што мама любіць птушак і матылькоў, і яна намалявала ў блакітным небе птушак, а на траўцы матылькоў. А ў цэнтры свайго малюнка Людачка паставіла маленькі домік. Домік быў шэры, дах на ім чырвоны, а сходкі жоўтыя. На сходках Людачка пасадзіла ката Мурзіка. Хвост у яго быў доўгі, доўгі.

Свае падарункі Людачка паклала на стол і пачала чакаць маму.

Мама сёння прыйшла раней. Убачыла яна на сваім стале Людаччыны падарункі і вельмі ўзрадавалася.

— Малайчына, дачушка. Рукі ў цябе спрытныя, умелыя. Будзеш некалі не горшай за маму ткачыхай. Дай я цябе пацалую.

Яна прыгарнула Людачку да сябе, пагладзіла яе па галоўцы і пацалавала ў шчочкі.

## Да мамінага свята

Снег яшчэ ляжыць ля хаты.
Кветак у садку няма.
Я да мамінага свята
Кветку вышыю
Сама.

І. МУРАВЕЙКА

# У чым не правы бацькі Лены?

ГЭТЫМІ днямі я атрымала пісьмо ад адной сваёй былой вучаніцы. 17-гадовая дзяўчына пісала:

«Самі па сабе мае бацькі людзі добрыя, але ўся справа ў тым, што яны не маглі знайсці «агульнай мовы» між сабой. Адно аднаму не хочуць уступіць. Яны ўвесь час шукалі прычыну для ўзаемных спрэчак, крыўд, зняваг. Такія адносіны паміж імі пачаліся з-за таго, што маёй маме здалося, што бацька стаў да яе няўважлівы. Яна ўвесь час думала аб гэтым і дрэнна адносілася да бацькі. За ўсё сваё дзяцінства я не ведаю выпадку, каб мы ўсе разам куды-небудзь пайшлі. Але і без нас мае бацькі нікуды разам не хадзілі. Бацька быў нам чужы. Проста чужы! Намі ён ніколі не цікавіўся, а калі і загаварваў, то толькі для прыліку, холадна. Адказвалі мы таксама холадна і коратка. Мы ніколі не бачылі, каб бацькі мірна размаўлялі. Яны або маўчалі, або абменьваліся з'едлівымі словамі, папрокамі. Часцей за ўсё мы чулі: «Абыдуся без цябе!», «Табе не падабаецца?», «Ідзі!» Непрыязнасцю бацькоўскіх адносін мы, дзеці, былі скаваны. Мы ніколі не маглі свабодна гуляць, смяяцца, весяліцца. Нейкі груз цяжару мы ўвесь час адчувалі. Бывала, калі з'яўляліся маці ці бацька, дзеці змаўкалі, смех і радасць тут жа згасалі.

Халодныя ўзаемаадносіны бацькоў, іх пастаянную варожасць мы адчувалі і нас гэта вельмі падаўляла.

У старшых класах школы мы ўжо былі вельмі далёкія ад бацькоў, паміж намі лягла дарога адчужэння.

Цяпер я вучуся завочна і працую на заводзе. У новым калектыве я ўжо амаль пераадолела сваю замкнутасць і нелюдзімасць. І ўсё ж я яшчэ не такая, як усе.

Я хачу, каб у нас не было такіх непрыязных узаемаадносін у сем'ях, каб дзеці ў іх раслі шчаслівымі і вясёлымі.

Лена».

Пісьмо Лены закранула вельмі важнае пытанне ўзаемаадносін бацькоў і ўплыў іх на выхаванне дзяцей. Лена права ў тым, што бацькі — гэта перш за ўсё выхавацелі і што поспех выхавання дзяцей залежыць ад сямейных адносін.

Выхаванне моладзі ў нашай краіне мае вялікае дзяржаўнае значэнне. Савецкая грамадскасць праяўляе ўвагу да пытанняў выхавання дзяцей у сям'і, для яе зусім не абыякава, як уплываюць бацькі на іх выхаванне. І гэта не выпадкова. Чалавек камуністычнага заўтра павінен выхоўвацца сёння.

Савецкая сям'я, свабодная ад буржуазна-ўласніцкіх адносін, — гэта месца, дзе фарміруюцца лепшыя чалавечыя якасці, дзе расцвітаюць самыя высакародныя чалавечыя пачуцці.

Усім вядома, што выхаванне дзіцяці пачынаецца ў сям'і, і ад таго, куды і як яно будзе накіравана, залежыць будучыня дзяцей. Вось чаму навука аб выхаванні на першае месца сярод выхавацеляў ставіць бацькоў.

Моцная, дружная сям'я, дзе пануе атмасфера ўзаемнай павагі і давер'я, дзе бацькі разумеюць адзін аднаго і ўсе пытанні вырашаюць мірна, дзе няма хлусні і ашуканства, добра ўплывае на развіццё і выхаванне дзіцяці.

Але ці ва ўсіх сем'ях клапоцяцца аб стварэнні такіх цёплых, добрых адносін?

На жаль, у нас ёсць яшчэ сем'і, дзе атмасфера недружалюбнасці, непавагі прыгнятае дзіця і адмоўна адбіваецца на фарміраванні яго асобы.

У такіх сем'ях разумовае і маральнае развіццё дзяцей праходзіць міма ўвагі бацькоў. Тут дзяцей і бацькоў звязваюць толькі жыллё і матэрыяльныя патрэбы. Але калі дзеці падрастаюць, яны вельмі лёгка адыходзяць ад бацькоў.

Беднасць і вузкасць духоўнага жыцця ў такіх сем'ях не можа не пакласці пэўнага адбітку на дзяцей. Змалку, не бачачы сваіх бацькоў сябрамі, блізкімі людзьмі, звязанымі агульнымі інтарэсамі і клопатамі, мэтамі і імкненнямі, і не адчуваючы на сабе ўплыву разумнай арганізацыі сямейнага жыцця, дзеці нярэдка самі заражаюцца холадам такіх адносін, робяцца замкнутымі, пасіўнымі, бессардэчнымі, абыякавымі. На гэтай глебе ў іх развіваюцца эгаізм, упартасць, непаслухмянасць і іншыя непажаданыя якасці характару.

Што датычыць бацькоў Лены, то характар іх узаемаадносін заслугоўвае грамадскага ганьбавання. Аслепленыя недавер'ем і непрыязнасцю, яны паступова адыходзілі адзін ад аднаго, хоць і жылі пад агульным дахам. Але гэта яшчэ не ўсё! Жадаючы «насаліць» адзін аднаму напускной абыякавасцю, яны пагаршалі свае ўзаемаадносіны, разбуралі асабістае шчасце, забываючы разам з тым пра дзяцей. А калі ў сям'і ёсць дзеці, трэба перш за ўсё думаць не аб сабе, не аб сваіх крыўдах, не аб сваёй самалюбнасці, а аб дзецях, аб іх будучыні.

Бацькі Лены, кіруючыся суб'ектыўнымі перажываннямі, забылі, што побач дзеці. Кожны з бацькоў не хацеў уступіць, ніхто першы не пажадаў стаць на шлях высвятлення непаразуменняў, якія склаліся. А такой жа нядобрай атмасферы ў сям'і Лены магло і не быць, калі б бацькі самі гэтага вельмі захацелі. Замест таго, каб пагаварыць з мужам сам-насам, указаць яму на праяўленні «няўважлівасці» да жонкі, маці яго дзяцей, жонка, затаіўшы крыўду, перастала ўдзяляць яму ўвагу. Бацька таксама не знайшоў смеласці душэўна пагаварыць з жонкай, пераканаць яе ў неабгрунтаванасці яе падазрэнняў. Такім чынам, дробнае самалюбства падавіла ўсе іншыя добрыя пачуцці.

У такой атмасферы сямейных адносін раслі дзеці. Іменна яны больш за ўсё цярпелі ад дрэнных узаемаадносін бацькоў.

І хто ведае, колькі б яшчэ адчувала Лена цяжар сваёй замкнутасці, баязлівасці, нелюдзімасці, калі б не апынулася ў здаровым вытворчым калектыве. З дапамогай калектыву Лена пераадолела некаторыя адмоўныя рысы свайго характару, вынесеныя з бацькоўскага дома. Мы не сумняваемся ў тым, што яна канчаткова вызваліцца ад іх таму, што вельмі жадае гэтага.

У нашым жыцці нямала дружных, моцных сем'яў, дзе ўзаемная падтрымка мужа і жонкі, чулыя адносіны адзін да аднаго, глыбокая павага, бязмежнае давер'е напаўняюць іх жыццё радасным і глыбокім зместам. У такіх сем'ях вырастаюць сумленныя людзі.

Узаемаадносіны бацькоў і дзяцей — вялікае і важнае пытанне. Пакідаць яго без увагі грамадскасці нельга. Нам усім трэба змагацца за шчаслівую, дружную сацыялістычную сям'ю, за працвітанне ў ёй самых светлых, самых цёплых і душэўных адносін. Толькі ў такой сям'і дзеці атрымаюць правільнае выхаванне.

**В. ЖУКОЎСКАЯ,**
кандыдат педагагічных навук.



Добра пастаўлена політэхнічнае навучанне ў мінскай школе № 2. Тут ёсць сталярная і механічная майстэрня, клас дамаводства.
На здымку: на занятках у механічнай майстэрні.

Фота П. Нікіціна

# Цытачы паведамляюць

## Звеннявая па ільну Ганна Іванюта

Растуць на Талачыншчыне кадры ільнаводаў. З кожным годам усё большым становіцца атрад майстроў вырошчвання высокіх ураджаяў «паўночнага шоўку». І слава аб іх ужо не можа схавацца за рамкі калгаса, раёна, яна ідзе далей, узносіць людзей за іх шчырую працу.

Так стала вядомай Ганна Логвінаўна Іванюта, звеннявая па ільну калгаса імя Сталіна. Яе звяно ў мінулым годзе атрымала па 9,22 цэнтнера ільнасемя на кожным з 9 гектараў пасеваў. На Талачынскі ільнозавод адвезена 35 тон высакаякаснай трасты. Гэта каля тоны валакна з гектара. Цудоўны вынік напружанай, самаадданай працы. Усю зіму Ганна Логвінаўна са сваімі дзяўчатамі не сядзела склаўшы рукі. Іх можна было бачыць з вёдрамі за зборам попелу і птушынага памёту. Яны рыхтавалі аргана-мінеральныя сумесі. Вечарамі праседжвалі за кніжкамі, вывучалі агратэхніку.

А ранняй вясной ім на дапамогу падключыліся калгасныя механізатары.

І лён вырас на славу тым, хто аб ім клапаціўся. Сёлета члены звяна абавязаліся атрымаць з кожнага гектара па тоне валакна і семя.

**В. ЧАПЦОЎ**

## З дапамогай актыву

Добра прайшла падпіска на газеты і часопісы ў Глазаўскім сельсавеце Уварavіцкага раёна. У гэтым вялікая заслуга начальніка аддзялення сувязі Агаф'і Афанасьеўны Жукавай. Гэта яна разам з грамадскімі арганізацыямі ў час падпісной кампаніі правяла вялікую работу. Ёй дапамагалі дэпутаты сельскага Савета, камуністы, камсамольцы. У сельсавеце 460 калгасных двароў. Тут выпісалі 1.150 газет і часопісаў. Падпіска пераважна гадавая. Гэты факт ярка сведчыць аб росце культуры і дабрабыту калгаснікаў.

**Н. КАНАПАЦКІ**

**Польскі камітэт хатніх паслуг арганізаваў жартоўны конкурс пад дэвізам: «Закасаўшы рукавы, бярыся за каструлю, Людвіг!» Удзельнікі конкурсу, а імі маглі быць толькі мужчыны, павінны былі ў мінімальна кароткі тэрмін прарабіць пэўны лік работ па дому і догляду грудных дзяцей. У склад вельмі строгага і кампетэнтнага журы ўваходзілі адны жанчыны. Конкурс прайшоў з вялікім поспехам. На фота: адзін з прэтэндэнтаў на прэмію. Паглядзіце, як старанна ён зацягвае нітку ў іголку!**



# *Кулінарыя*

## РАГУ З ЗЯЛЁНАГА ГАРОШКУ І МОРКВЫ

2 шклянкі зялёнага гарошку, 2 пучкі морквы, 1 ст. лыжка масла, 1 ст. лыжка мукі, 1 шклянка малака, 1 ст. лыжка цукру, соль.

Ачышчаную свежую моркву нарэжце кавалачкамі, дадайце масла і тушыце да размякчэння. Затым дадайце гарошак, крыху вады і зноў тушыце. Пасля гэтага муку падсмажце на масле, разбаўце малаком, крыху папарыце, дадайце соль, цукар. Гэтым соусам заліце тушаны гарошак з морквай і падагрэйце.




## ПОНЧЫКІ З БУЛЬБЫ

800 г бульбы, 20 г масла, 80—100 г мукі, 2 яйкі, 2 лыжкі смятаны, 10 г дрожджаў, соль, перац.

Звараную ў лупінах бульбу ачысціць, працерці праз сіта, астудзіць. Дадаць дрожджы, размешаныя са смятанай, яйкі, соль, перац, 2—3 лыжкі мукі. Расцерці старанна да гладкасці. Рабіць хутка (бульбяная маса не можа доўга заставацца з дрожджамі, таму што яна хутка расце і ў час смажання пончыкі распадаюцца) шарыкі велічынёй з вялікі грэцкі арэх або палачкі; закладваць у моцна разагрэты шмалец. Смажыць да залацістага адцення. Вымаць шумоўкай на папяросную паперу. Пакласці ў салатнік. Падаваць з вострым соусам або да мяса.

## ПЯСОЧНЫ СЕЧАНЫ ПІРОГ З ЛІМОНАМ

2 шклянкі мукі, 250 г або 1 шклянка масла, 4 жаўткі, 1 шклянка цукру-пяску, 1/3 чайнай лыжкі солі, 1/3 чайнай лыжкі соды.

Начынка: два лімоны, 1 шклянка цукру-пяску.

Змешаную з содай муку прасейце і збярыце ў кучку, у сярэдзіне яе зрабіце паглыбленне. Разатрыце жаўткі з цукрам і соллю дабяла; калі знікнуць крупінкі цукру, дадайце масла, усё разатрыце ў аднародную масу і пакладзіце ў паглыбленне, зробленае ў кучцы мукі. Муку разам з ахаладжаным расцёртай масай пасячыце нажом да стану дробнай крупкі. Атрыманую масу падзяліце на дзве кучкі. Адну кучку рассыпце на сухую форму роўным слоем. На гэты слой пакладзіце лімонную масу, якая падрыхтоўваецца так: праз мясарубку прапускаецца лімон разам са скуркай, але без зярнят, з дадаваннем цукру. Лімонную масу разраўняйце і засыпце другой кучкай сечанай мукі, затым злёгку разгладзьце і запякайце пры тэмпературы 220°—240° на працягу 25—30 мінут.

## ПІРОГ З ЦЕСТА НА СМЯТАНЕ

Мука пшанічная — 2,5 шклянкі, яйкі — 2 шт., смятана — 1/2 шклянкі, масла сметанковае — 150 г, соль — 1/2 чайнай лыжкі.

Яйкі, смятану і соль змяшаць, пакласці ў гэтую сумесь разрэзанае на дробныя кавалачкі сметанковае масла, усыпаць пшанічную муку і хутка замясіць цеста. Даць цесту паляжаць мінут 30—40 на холадзе, затым раскачаць яго на два праснакі па форме патэльні або бляхі таўшчынёй каля 1/2 см. Адзін праснак пакласці на патэльню або бляху, на яго пакласці роўным слоем начынку з мяса, рысу, капусты, свежых грыбоў або любую іншую, накрыць другім праснаком, краі цеста злучыць і зашчыпаць. Верх пірага змазаць яечным жаўтком і пячы ў духоўцы або ў печы.



# УРАЧ РАІЦЬ

У рэдакцыю звярнулася наша чытачка В. Я. в г. Оршы. Вось што яна піша: «Мне 26 год, два гады замужам, але за гэты час я ні разу не зацяжарыла. Вельмі прашу праз часопіс адказаць на мае пытанні.

1. Ці можа наступіць цяжарнасць пры недаразвітай матцы? Ці адно і тое ж азначаюць словы «малая» і «недаразвітая» матка?

2. Што за хвароба «хранічнае запаленне прыдаткаў» і ці ўплывае яна на цяжарнасць?

3. Якія ёсць спосабы лячэння?

4. Ці карысна займацца фізкультурай?»

**Адказвае на гэтыя пытанні дацэнт, гінеколаг І. С. Лягенчанка.**

У бясплодным шлюбе не заўсёды бывае вінавата жанчына. Лічаць, што ў адной трэці выпадкаў муж з'яўляецца прамым віноўнікам бясплоднасці, а ў трэці выпадкаў — ускосным віноўнікам, заражаючы жонку ганарэяй, і толькі ў трэці выпадкаў бясплоднасць з'яўляецца вынікам анамаліі развіцця палавых органаў жанчыны або вынікам яе хваробы.

«Недаразвітая» матка і «малая» гэта адно і тое ж паняцце. Бясплоднасць бывае толькі пры высокай ступені недаразвіцця маткі. Жанчыны, якія маюць нармальны менструальны цыкл, могуць зацяжарваць і з недаразвітай маткай.

Самай частай прычынай жаночай бясплоднасці з'яўляюцца запаленчыя працэсы жаночых палавых органаў, як вострыя, так і хранічныя. Пры хранічным запаленні прыдаткаў маткі матачныя трубы часта становяцца непраходнымі і тады магчымасць зачацця выключаецца.

Для паспяховага лячэння бясплоднасці неабходна ўстанавіць яе прычыну. У першую чаргу неабходна даследаваць семя мужа і толькі пасля гэтага павінна быць ўсебакова абследавана жонка.

Калі ў працэсе абследавання будзе ўстаноўлена, што бясплоднасць залежыць ад хранічнага запалення прыдаткаў маткі, то жанчына павінна прыняць цэлы курс лячэння, куды ўваходзяць сульфанамідныя прэпараты, антыбіётыкі (пеніцылін, стрэптаміцын і інш.), фізічныя метады лячэння: дытэрмія, азакерыт, гразі і інш. Пры ганарэйных захворваннях праводзіцца курс спецыфічнага лячэння.

Пасля лячэння неабходна праверыць праходнасць матачных труб шляхам прадзьмування іх паветрам або рэнтгенаграфіі. Калі трубы акажуцца стойка непраходнымі, то для аднаўлення праходнасці іх рэкамендуюць аперацыі.

Пры недаразвіцці маткі звычайна добра ўплывае курортнае лячэнне або лячэнне дыятэрміяй.

Праводзіць ранішнюю фіззарадку вельмі карысна — яна паляпшае кровазварот, аднаўляе мышачны тонус, надае бадзёрасць і г.д. Калі ж пры выкананні практыкаванняў адчуваецца боль, то лепш фіззарадкай не займацца, таму што можна выклікаць абвастрэнне запаленчага працэсу.

## Ці можна пазбавіцца ад чырвоных радзімых плям

Чырвоныя радзімыя плямы маюць сасудзістае паходжанне. Большай часткай гэта прыроджаныя ўтварэнні самай рознай формы, памераў і колеру.

Чырвоныя радзімыя плямы бываюць плоскія або ўзвышаныя над узроўнем скуры, часам з утварэннем вялікіх крываносных пухлін, так званых вузлаватых ангіём. Чырвоныя радзімыя плямы, падвяргаючыся траўме, могуць крываточыць, а вузлаватыя ангіёмы нават выклікаць значную страту крыві. Радзімыя плямы сустракаюцца на розных частках цела, але часцей за ўсё на твары і шыі. Звычайна з ростам цела яны павялічваюцца ў памеры, хоць вядомы выпадкі, калі радзімыя плямы знікалі без якога-небудзь умяшання.

Існуе некалькі спосабаў лячэння чырвоных радзімых плям. Так, напрыклад, пры вузлаватых ангіёмах добрыя вынікі дае прымяненне радыю, а пры плоскіх або злёгку ўзвышаных плямах — вуглекіслы снег. Аднак лячэнне гэта працяглае і пакідае на скуры рубцы.

Чырвоныя радзімыя плямы знішчаюць таксама хірургічным шляхам: ссячэннем пухліны з далейшай перасадкай скуры. Вынікі гэтай аперацыі былі б найлепшымі, калі б устаўлены кавалак скуры не адрозніваўся ад нармальнай скуры сваёй жаўцізной.

У апошні час выпрацаван дзейсны метад лячэння шляхам электракаагуляцыі, гэта значыць прыпякання электрычнасцю. Метад гэты безбалесны, але працяглы: ад года да трох год з перапынкамі. Чым цямней радзімая пляма, тым хутчэй яе лячэнне; чым яна святлей, тым больш працяглае лячэнне. Касметычны эфект пры гэтым найбольш спрыяльны, дэфармуючых рубцоў не бывае, застаецца ўмераная атрафія скуры з поўным знікненнем чырвані або большым яе пабляднеңнем. Электракаагуляцыя часам камбінуецца з абпраменяннем радзімай плямы праменнямі Букі, але за апошнія гады гэты метад прымяняюць толькі пры ўскладненнях.

У апошнія гады ў радзе навукова-даследчых устаноў вывучаецца эфектыўнасць прымянення радыёактыўных ізатопаў.

З якога ўзросту можна лячыць чырвоныя радзімыя плямы? Дробныя ангіёмы, плоскія і вузлаватыя радзімыя плямы рэкамендуецца знішчаць у малым узросце, каб яны не павялічваліся з ростам цела. Вялікія радзімыя плямы лепш за ўсё лячыць, пачынаючы з 14—15 год.

**Урач-касметолаг Т. Ф. НАЗАРАВА**

## *Некалькі парад*

Каб асвяжыць мяса або рыбу, якія пачалі псавацца, на дно каструлі кладуць кавалак драўнянага вугалю велічынёй прыкладна з курынае яйка. Мяса наразаюць на кавалкі, добра прамываюць у халоднай вадзе, кладуць у каструлю з вугалем і заліваюць халоднай вадой. Вады наліваюць столькі, каб яна пакрыла мяса, і пакідаюць стаяць 2—3 гадзіны, пасля чаго вугаль вымаюць і мяса вараць у той жа вадзе.

●

Пах выкіпеўшага на печ малака непрыемны і хутка распаўсюджваецца па ўсяму жыллю. Накрыйце выкіпеўшае малако вільготнай газетай і папырскайце яе зверху воцатам. Воцат поўнасцю паглынае пах згарэўшага малака.

●

Калі хочуць захаваць белай скуру паравых курaнят і курэй, то перад прыгатаваннем трэба працерці іх лімонным сокам або растворам лімоннай кіслаты.

●

Засохшы абутковы крэм можна зрабіць прыгодным, паставіўшы бляшанку з крэмам у сподак з гарачай вадой. Калі крэм ад цяпла расплавіцца, у яго дадаюць крыху шкіпінару (бутэлечку са шкіпінарам таксама папярэдне саграюць у кубку з вадой), старанна перамешваюць і даюць астыць. Трэба памятаць, што шкіпінар лёгкі на загаранне. Таму разаграваць яго, як і крэм, на адкрытым агні нельга. Некалькі кропель спірту, улітыя ў крэм, надаюць абутку больш яркі бляск.

## ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

**Толькі 29,2 працэнта, гэта значыць менш адной трэці паверхні зямлі, займаюць мацерыкі і астравы; астатнія дзве трэці, дакладней 70,8 працэнта яе, пакрываюць акіяны, моры і азёры.**

* * *

**Самая вялікая з жывёл — сіні кіт, або блювал. Сэрца дарослага блювала важыць 600—700 кілаграмаў, гэта значыць столькі ж, колькі вялікі конь, а мозг—усяго 6—7 кілаграмаў.**

* * *

**Сярод жывёл менш за ўсіх баяцца холаду качкі і гусі. Доследы, якія праводзіліся нарвежскімі вучонымі, паказалі, што яны выносяць тэмпературу да 110 градусаў, у той час як белыя мядзведзі і цюлені толькі да 80 градусаў.**

* * *

**Некаторыя птушкі — арлы, грыфы, кондары—могуць набіраць вышыню да 6000—7000 метраў.**

* * *

**Збожжа, якое штогод знішчаецца ва ўсім свеце насякомымі-шкоднікамі, хапіла б для харчавання 200 мільёнаў чалавек.**

* * *

**Каб выпрацаваць 100 грамаў мёду, пчала павінна аблётаць прыкладна мільён кветак, прынесці 12 тысяч нош нектару.**

* * *

**Самай старой кветкай з'яўляецца ружа, якая расце ў нямецкім горадзе Гільдэсгейм. Яе ўзрост—каля тысячы год. Дзіўна, што да гэтага часу кожнай вясной на ёй распускаюцца цудоўныя кветкі.**

* * *

**Бамбук—адна з самых хуткарастучых раслін на зямлі. За суткі ён вырастае на 50—60 сантыметраў.**

На вокладцы малюнак А. Пабядзінскага.

# Моды



1



2



3



4



5



6

1. Хатняя сукенка з фартухом. Прамая, не адразная па таліі сукенка зверху данізу зашпільваецца на гузікі; рукавы ўстаўныя. Фартух з грудкай на адной шлейцы вакол шыі аздоблен тканінай сукенкі. Размеры любыя.

2. Блузка з белага шоўку. Спартыўны каўнер з вялікімі адваротамі. Засцежка схавана пад складкай. Трохчацвяртныя рукавы. Спінка кроіцца разам з паткамі, якія знаходзяцца ўверсе пераду.

3. Прыгожая блузка з тафты. Складка вакол дэкальтэ і ўздоўж пераду. Кароткія рукавы. Плісіраваны бант прасунуты пад складку.

4. Касцюм з букліраванай тканіны ў клетку. Жакет аднабортны, прылягаючы, з засцежкай на тры гузікі; каўнер шалікам; рукавы ўстаўныя; кішэні праразныя, з клапанамі; на спінцы шоў. Спадніца прамая, шоў ззаду заканчваецца складкай. Размеры любыя.

5. Адразная па таліі сукенка з муару або тафты. Ліф прылягаючы, адкрыты; вялікі каўнер надзеты наверх ліфа. Спадніца па сілуэту нагадвае цюльпан; у таліі закладзены мяккія складкі-вытачкі, якія свабодна разыходзяцца. Рэкамендуемыя размеры 46—48.

6. Сукенка з шырокай спадніцай прамога крою, закладзенай сустрэчнымі складкамі; дапоўнена белым каўняром. Рукавы ўстаўныя. Шырокі пояс зашпільваецца на чатыры гузікі. Рэкамендуемыя размеры 46—48.

7. Аднабортнае звужанае ўнізе паліто з вялікім каўняром і цэльнакроенымі рукавамі Кішэні праразныя, вертыкальныя. На спінцы шоў. Размеры любыя.



7

Адказны рэдактар А. П. УС. Рэдакцыйная калегія: М. Н. БАРСТОК, А. С. ВАСІЛЕВІЧ, Г. Л. ДАЗОРЦАВА, Т. Т. ДЗМІТРЫЕВА, А. Н. ЗАХАРАВА, М. Ф. НІКІФАРАВА, М. М. ТУР, В. І. ФІЛІПАВА.

АТ 03849. Журнал «Работница и крестьянка» на белорусском языке. Издание ЦК КП Белоруссии.

Падпісана да друку 3/ІІ-61 г. Адрас рэдакцыі: Мінск, праспект імя Сталіна, 77. Тэлефоны: адказ. рэдактара—3-17-51, адказ. сакратара—3-38-14, аддзелаў прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры—3-38-24.

Друкарня імя Сталіна, Мінск. Цана 18 кап. Дадатак—выкрайка. Друк. арк. 3. Аўт. арк. 4. Тыраж 236671 экз. Зак. 1.

6199

